

Дзе зарабіць студэнту летам

СТАР. 3



Наша Лэдзі Анімацыя

СТАР. 5



Цяжкі горад, дзе лёгка дыхаць

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЛІПЕНЯ 2015 г. СУБОТА № 135 (27993) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# АБ'ЁМЫ, ЯКАСЦЬ, АСАРТЫМЕНТ

## Прэзідэнт запатрабаваў безумоўнага выканання дадзеных раней даручэнняў па мадэрнізацыі ААТ «Камволь»

**Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе, прысвечанай пытанням развіцця прадпрыемства, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Прэзідэнт не аднойчы звяртаўся да пытанняў дзейнасці адкрытых акцыянерных таварыстваў «Камволь» і «Сукно», наведваў іх. У адпаведнасці з указам №510, падпісаным кіраўніком дзяржавы 14 лістапада 2013 года, інвестыцыйны праект па стварэнні новай вытворчасці па выпуску канкурэнтаздольных тканін бізнес- і эканомкласа ва ўмовах адкрытага акцыянернага таварыства «Камволь» прадугледжваецца рэалізаваць да канца 2015 года. Выхад на праектную магутнасць па выпуску да 6 млн паг. м тканіны ў год запланаваны ў 2017 годзе. Прадугледжвалася правесці комплексную мадэрнізацыю вытворчага корпуса, выканаць будаўніча-мантажныя работы, камплектацыю і мантаж асноўнага тэхналагічнага абсталявання, асвоіць выпуск тканін, пабудаваць аўтаномныя энергакрыніцы і аб'екты дапаможнага і абслугоўваючага прызначэння.

Кіраўніку дзяржавы даложана аб завяршэнні двух этапаў мадэрнізацыі. У канцы верасня чакаецца заканчэнне трэцяга.

У той жа час, па інфармацыі кантралюючых органаў, тэрміны мадэрнізацыі зацягваюцца, павялічваецца кошт будаўніча-мантажных работ.

Прэзідэнт даў жорсткае даручэнне прытрымлівацца першапачаткова вызначаных тэрмінаў, а таксама прарэвізаваць кошт. У выніку мадэрнізацыі прадпрыемства павінна працаваць з рэнтабельнасцю не ніжэйшай за 15-20% з тым, каб акупіць выдаткі. Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў прысутных, што заканчваецца адказны этап мадэрнізацыі прадпрыемства і надыходзіць не менш адказны па заваяванні рынкаў збыту.

Добрыя магчымасці для таварыства адкрываюцца ў сувязі з адменай калегіяй Еўразійскай эканамічнай камісіі абмежаванняў доступу беларускіх камвольных тканін на расійскі рынак. Па словах генеральнага дырэктара прадпрыемства Сяргея Гаравога, праліčваецца магчымасць паставак прадукцыі ў краіны СНД, Еўрапейскага саюза. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ў першую чаргу закрыць патрэбы ўнутранага рынку ў прадукцыі ААТ «Камволь».

Ён падкрэсліў, што абяцаў яго калектыву і ўсёй краіне, што ў выніку мадэрнізацыі гэта будзе сучаснае прадпрыемства. Чакаецца, што «Камволь» стане самым магутным прадпрыемствам на постсавецкай прасторы з пункту гледжання аб'ёмаў вытворчасці, якасці і асартыменту выпускаемай прадукцыі.

Аляксандр Лукашэнка мае намер у канцы верасня наведаць таварыства, каб асабіста пракантраляваць, як завяршаецца мадэрнізацыя. Прэзідэнт запатрабаваў не толькі захаваць абодва прадпрыемствы («Камволь» і «Сукно»), але і працоўныя месцы на іх, эфектыўна правесці мадэрнізацыю, каб іх прадукцыя была канкурэнтаздольнай у доўгатэрміновай перспектыве.

# ЖНІВО ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ



**Жніво ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Новае жыццё» Уздзенскага раёна, як толькі скончыўся дождж, пачалося з уборкі спелага рапсу. Наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук застаў фактычна зажынкі — учора звяно механізатараў-камбайнераў гаспадаркі рабіла на спелых палетках першы круг. Нялёгкая «бітва» за вялікі хлеб пачалася. Марудзіць не даводзіцца: надвячорак — проста ў полі, стоячы. Прымаўка «Летні дзень год корміць» ва ўсе часы актуальная.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Ключавой задачай для рэспублікі сёння з'яўляецца эканамічны рост. Пры гэтым хачу падкрэсліць, што любы эканамічны рост не павінен быць штучным і не за кошт нарошчвання знешніх даўгоў. Ключ поспеху да выканання сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2015 год найперш у выкананні намечаных паказчыкаў па экспарце. Для гэтага неабходна больш актыўна працаваць над дыверсіфікацыяй рынкаў збыту, каб не быць залежнымі толькі ад аднаго з іх».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15187,00 | ▼ |
| Еўра | 16528,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 267,24 | ▼ |
| Укр. грыўня | 675,73 | ▼ |

■ Выбары-2015

# ПА ПАРАДКУ НУМАРОЎ...

## Учора ЦВК зарэгістравала тры першыя ініцыятыўныя групы магчымых кандыдатаў

**Пад нумарам першым зарэгістравана ініцыятыўная група дзеючага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Камісія адзначыла, што ўсе прадстаўленыя дакументы дадзенай ініцыятыўнай групы адпавядаюць заканадаўству, колькасць яе ўдзельнікаў 10 тысяч 577 чалавек. Кіраўнік групы — Міхаіл Орда.**

Лідзія Ярмошына патлумачыла, як адбываецца праверка дакументаў на гэтым этапе: апытанне членаў групы не праводзіцца, праглядаюцца толькі серыі і нумары пашпартоў, каб вызначыць, ці ўсе члены ініцыятыўнай групы з'яўляюцца беларускімі грамадзянамі, а таксама даты іх нараджэння, каб упэўніцца, што ўзрост таксама адпавядае выбарчаму праву. На дату пачатку збору подпісаў (23 ліпеня) усе члены ініцыятыўнай групы павінны быць старэйшая за 18 гадоў.

Пад нумарам два ЦВК зарэгістравала ініцыятыўную групу Сяргея Калякіна (кіраўнік — Валерый Ухналёў), пад нумарам тры — Сяргея Гайдукевіча (кіраўнік — Анатоль Хішчэнка).

У дакументах гэтых дзвюх груп (першая колькасцю 1511 чалавек, другая — 2481) былі знойдзены парушэнні: два чалавекі не мелі беларускага грамадзянства, двое аказаліся маладзейшыя за 18 гадоў. Камісія выключыла гэтых асоб са спісаў.

На пятнічным пасяджэнні, акрамя 12 членаў Цэнтрвыбаркама, прысутнічалі акрэдытаваныя ў ЦВК назіральнікі ад рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый (Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», Беларуская партыя працы і справядлівасці, Беларускі Хельсінскі Камітэт), а таксама прадстаўнікі трох ініцыятыўных груп, якія падалі заявы аб рэгістрацыі ў ліку першых, і журналісты.

СТАР. 2

■ Круглы стол

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» — ПЛЯЦОЎКА МІЖНАРОДНАГА КУЛЬТУРНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

**Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» сёлета ў чарговы раз збіраў прыхільнікаў песеннага, тэатральнага, выяўленчага мастацтва. Праходзілі тэатральныя паказы, кірмашы народных рамёстваў, канцэрты шматлікіх артыстаў і калектываў, сустрэчы ў фармальных і нефармальных умовах. Але менавіта сёлета найбольш яскрава выявілася аб'ядноўчая, міратворчая сутнасць форуму. Пра гэта вельмі вобразна гаварыў і Прэзідэнт краіны падчас цырымоніі закрыцця фестывалю. «Славянскі базар» ужо даўно выйшаў за межы проста музычнага конкурсу, наша краіна ўпэўнена заяўляе аб сабе як цэнтр не толькі палітычнага, але і культурнага міжнароднага дыялогу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

**Як пацверджанне рознабаковага развіцця такога дыялогу сёлета ў рамках «Славянскага базару» пад эгідай Міністэрства інфармацыі прайшоў круглы стол «Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцей. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў». Хто сёння фарміруе грамадскую думку і свядомасць? Як гэта адбываецца ў фармаце славянскага адзінства, светапогляду? На гэтыя і іншыя пытанні падчас круглага стала шукалі адказы міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА, старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь ДАВЫДЗЬКА, дырэктар — галоўны рэдактар РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, галоўны прадзюсар Нацыянальнай тэлекампаніі Украіны Уладзіслаў БАГІНСКІ, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Валерый АНІСЕНКА, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір НАВУМОВІЧ, загадчыца кафедры мастацтва эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ірына ДАРАФЕЕВА, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА, генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва InterMedia Яўген САФРОНАЎ. Да размовы далучаліся і прысутныя журналісты.**

СТАР. 6



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Вінаватых у падзенні «Боінга» пакуль не называюць

Міжнародная група экспертаў, якія расследуюць катастрофу «Боінга-777» на ўсходзе Украіны, яшчэ не высветліла, быў збіты лайнер ракетай, выпушчанай з зямлі або іншым самалётам. Пра гэта распавёў прадстаўнік Генпракуратуры Нідэрландаў Вім дэ Брун. Ён таксама ўдакладніў, што адказныя за падзенне лайнера авіякампаніі Malaysia Airlines яшчэ не выяўленыя. Паводле слоў прадстаўніка Генпракуратуры, прамежкавыя вынікі расследавання могуць быць апублікаваны да канца года, але канчатковыя — толькі ў наступным годзе.

15 ліпеня тэлекампанія CNN размясціла матэрыял з інфармацыяй сваіх крыніц, што распавялі аб праекце дакладу, які падрыхтавалі ўдзельнікі расследавання гібелі «Боінга». Згодна з публікацыяй, спецыялісты прыйшлі да высновы, што лайнер быў збіты ракетай з зямлі, выпушчанай з тэрыторыі, якая знаходзілася пад кантролем апалчэнцаў. Часткова віна ўскладаецца на Malaysia Airlines, што праігнаравала практыку іншых авіяперавозчыкаў пазбягаць палётаў над зонай канфлікту.

### Эстонія страціць мільёны з прычыны крызісу ў Грэцыі

Магчымы выхад Грэцыі з еўразоны прывядзе да таго, што Эстонія страціць сотні мільёнаў еўра. Такую ацэнку даў прэм'ер-міністр прыбалтыйскай дзяржавы Тааві Рыйвас. Кіраўнік урада таксама ўхваліў рашэнне парламента Грэцыі, які прыняў закон аб рэформах. Рыйвас выступіў супраць Grexit (ад англійскіх Greece — «Грэцыя», і exit — «выхад»). «Але фінансавыя страты — гэта толькі верхавіна айсберга. Значна большую небяспеку ўяўляе з сябе разбурэнне еўрапейскага адзінства», — папярэдзіў ён.

### На Хароне знайшлі «касмічны замак»

Аўтаматычная міжпланетная станцыя New Horizons падчас свайго палёту міма карлікавай планеты Плутон зрабіла здымак Харона — яе найбуйнейшага спадарожніка. На ім навукоўцы выявілі незвычайную геалагічную структуру — упадзіну з вялікай выпукласцю ў цэнтры, якая нагадвае сярэднявечны замак (паведамляе НАСА). Яе працягласць складае 390 кіламетраў. Глыбіню і вышыню гары ў яе цэнтры не паведамляюць, аднак, мяркуючы па фатаграфіях, яны павінны дасягаць некалькіх сотняў метраў. На здымку таксама відаць невялікую колькасць ударных кратараў, якія размяшчаюцца ў раёне ўпадзіны. Станцыя New Horizons 14 ліпеня на хуткасці каля 14 кіламетраў у секунду наблізілася да Плутона на мінімальную адлегласць — 12,5 тысячы кіламетраў.



ISSN 1990 - 763X

15135>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Навукоўцы ўпершыню вырасцілі чалавечае сэрца

**Жывое сэрца было вырашчана ў лабараторных умовах пры дапамозе ствалавых клетак.**



Вучоным з каліфарнійскага ўніверсітэта Берклі ўдалося вырасціць паменшаную копію чалавечага сэрца. Створаная ў лабараторных умовах копія органа ў некалькі разоў меншая за арыгінал, аднак нават такое мініяцюрнае сэрца здольна функцыянаваць дзякуючы спецыяльнай сістэме са ствалавых клетак. У сваёй працы спецыялісты выкарыстоўвалі ўнікальныя плюрыпатэнтныя ствалавыя клеткі, якія могуць дыферэнцавацца на ўсе тыпы клетак.

У далейшым даследчыкі плануюць выкарыстоўваць штучна створанае сэрца для медыцынскіх і фармакалагічных даследаванняў. Таксама вырашчаная ў лабараторных умовах мадэль будзе прымяняцца для пошуку прычын узнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў.

КОРАТКА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон «Аб барацьбе з карупцыяй».

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 326, які прадугледжвае стварэнне холдынга па вытворчасці алкагольнай прадукцыі, у які ўвойдуць сем арганізацый «Белдзяржхарчпрам».**

Урад Расіі адобрыў пагадненне аб прадастаўленні Беларусі дзяржкрэдыту ў рублях на суму, эквівалентную $760 млн. Адпаведнае распараджэнне Кабінета міністраў апублікавана на афіцыйным інтэрнэт-партале прававой інфармацыі.

**У маі доля работнікаў Беларусі з заработнай платай ніжэйшай за Br2 млн склала 2,7% ад усёй колькасці работнікаў у арганізацыях, якія даследаваліся; удзельная вага работнікаў з заработнай платай звыш Br10 млн склала 10,1%, у тым ліку звыш Br20 млн — 1,1%.**

Плывец Ігар Бокій выйграў чацвёрты залаты медаль на чэмпіянаце свету па плаванні сярод паралімпійцаў. Беларус стаў пераможцам на 400 м вольным стылем.

■ Купляем разам

# ГЛЯДЗЕЦЬ ВА ЎСЕ ВОЧЫ

## На што трэба абавязкова звяртаць увагу, набываючы кватэру



**Адзін мой добры знаёмы летась купіў двухпакаёвую кватэру на другасным рынку жылля ў сталіцы. Адразу быў задаволены на ўсе 100% — дом няхай і немалады, але яшчэ трывалы, ціхі дворык, зусім побач крама і метро праз чатыры прыпынкі. Кватэра невялікая, але ўтульная, а самае галоўнае — недарагая для гэтага раёна. Аднак ужо праз тры месяцы пасля здзелкі ружовыя акуляры з яго вачэй зваліліся і новы гаспадар адшукаў цэлы набор сур'ёзных недахопаў сваёй «ідэальнай» кватэры. Толькі пасля дэталёвай разборкі мудрагелістых прыёмаў пры продажы такога жылля таварыш зразумеў, дзе ён «пракалоўся...**

### ХАТНЯЯ ІНСЦЭНІРОЎКА

У прадаўцоў нерухомасці цяпер існуе нямала рознага кшталту хітрыкаў, якія дазваляюць падмануць пільнасць кліента, прадставіць жыллё ў больш выгадным святле, чым яно ёсць насамрэч. Асабліва калі тое ўжо добра зношана. З'явіўся нават спецыяльны маркетынгавы прыём — хоум-стэйджынг (у перакладзе з англійскай мовы — хатняя інсцэніроўка, пастаноўка), якім прасунутыя гаспадары ўсё больш актыўна карыстаюцца для нівеліроўкі недахопаў.

Верагодна, што патэнцыйны пакупнік не дайшоў бы нават да дзвярэй кватэры, калі б перад яго прыходам у пад'ездзе і на пляцоўцы капітальна не прыбралі. Што тычыцца самой кватэры, то святлейшай і прасторнейшай яе робяць вымытыя вокны і добрае асвятленне. А яшчэ маркетолагі раяць выкінуць усе старыя рэчы, якія захламляюць прастору, лепш прыбраць фатаграфіі, узнагароды і дзіцячыя цацкі. У гэтым выпадку пакупнік зможа прымераць кватэру ўжо на сябе ў якасці будучага гаспадара.

СТАР. 3

# ПРЭЗІДЭНТ ПРЫНЯЎ З ДАКЛАДАМ...

## старшыню Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэя Шорца

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб сітуацыі ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Мотавела». Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў навесці парадак на прадпрыемстве.

У час сустрэчы канстатавалася, што сітуацыя, якая складваецца сёння на «Мотавела», у тым ліку эканамічная, далёкая ад ідэальнай, але яна выпраўляецца. Прэзідэнт паставіў канкрэтныя задачы па паляпшэнні работы прадпрыемства, захаванні яго брэнда.

## міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча па яго просьбе

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выкананні яго даручэнняў, што датычыцца рэформы Міністэрства ўнутраных спраў, якая практычна завершана. Была праведзена кадравая аптымізацыя, ліквідавана частка рудыментарных падраздзяленняў. Вызваленыя сродкі выкарыстаны на развіццё міністэрства, павышэнне грашовага забеспячэння супрацоўнікаў, паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Акрамя таго, быў цалкам перагледжаны ўвесь спектр задач, якія стаяць перад МУС, неўласцівыя міністэрству функцыі скасаваны.

Аляксандр Лукашэнка даручыў прадоўжыць аптымізацыю працы МУС, у тым ліку кадравую і функцыянальную. У найбліжэйшы час кіраўніку дзяржавы будуць прадстаўлены канкрэтныя прапановы на гэты конт.

Акрамя таго, Прэзідэнту даложана пра некаторыя аператыўныя матэрыялы, якія знаходзяцца ў распрацоўцы МУС, у тым ліку аб стане спраў па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй.

# ПА ПАРАДКУ НУМАРОЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Лідзія Ярмошына паведаміла прадстаўнікам СМІ, што ёсць праблемы з падачай дакументаў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп. «Па-першае, не ўсе групы створаны ў колькасці, неабходнай для рэгістрацыі (100 чалавек. — **Аўт.**). Некаторыя абяцалі данесці дакументы сёння, і гэта магчыма», — сказала яна. Акрамя таго, некаторыя заявы на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы пададзены з парушэннямі: дасланы па пошце, няма натарыяльна засведчанай даверанасці ў выпадку, калі прэтэндэнт у кандыдаты не сам прынёс дакументы, адсутнічаюць копіі старонак пашпарта, якія даказваюць пражыванне патэнцыйнага кандыдата ў Рэспубліцы Беларусь не менш за 10 гадоў перад выбарамі, і іншыя.

— Пакуль я бачу перспектыву, рэальную і ясную, для пяці прэтэндэнтаў, усяго толькі, — падзялілася з журналістамі старшыня Цэнтрвыбаркама наконт мяркуемай колькасці зарэгістраваных ініцыятыўных груп.

Пра ўдзел жанчын у прэзідэнцкай гонцы яна адказала: «Гэта добра, але ўсё ж такі жанчына тут не мае ніякага паслаблення нават з прычыны полу. Яна павінна дзейнічаць гэтак жа правільна і дакладна, як і мужчына. Дакументы, якія падала спадарыня Караткевіч, значна адрозніваюцца ад тых, што падалі іншыя дамы. Найперш за ўсё, яе група непараўнальна большая».

16 ліпеня па пошце ў ЦВК былі прадстаўлены дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні Заблоцкага Сяргея Віктаравіча кандыдатам у Прэзідэнты Беларусі. Таксама ўчора, у апошні дазволены для гэтага дзень, у Цэнтральную камісію Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэферэндумаў паступілі дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп Біруковай Тамары Венядзіктаўны, Цярэшчанкі Віктара Іванавіча (кіраўнік ініцыятыўнай групы — Алег Несцяркоў), Улаховіча Мікалая Дзмітрыевіча (кіраўнік групы — Міхаіл Образаў) і Юдаева Аляксандра Анатольевіча (кіраўнік групы — Таццяна Бурая).

Цэнтральная выбарчая камісія плануе разгледзець усе заявы, якія паступілі ў два апошнія дні, у панядзелак. Згодна з заканадаўствам, пытанне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы павінна быць вырашана не пазней за 5-дзённы тэрмін з дня паступлення дакументаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# ГНУТКАЕ СПАЛУЧЭННЕ

### Заканадаўцы абяцаюць забяспечыць паспяховае суіснаванне зон свабоднага гандлю розных інтэграцыйных аб'яднанняў

**Пра гэта паведаміў учора ў Савеце Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Малдова Мікалая Цімофці з кіраўнікамі дзвюх палат беларускага парламента.**

Старшыня Савета Рэспублікі запэўніў высокага госця, што беларускія парламентарыі вельмі рады дамоўленасцям, якія былі дасягнуты ў першы дзень яго візіту ў Беларусь.

— Гэта сапраўды новая старонка ў нашых адносінах, бо вы ўжо маеце пэўныя дамоўленасці з аб'яднанай Еўропай, а мы з першага студзеня з'яўляемся членамі Еўразійскага эканамічнага саюза. І там, і там у нашых краін існуюць зоны свабоднага гандлю, што патрабуе пільнай увагі, бо гэта не простае спалучэнне і механічна іх вельмі складана аб'яднаць, — прызнаўся спікер верхняй палаты. — У гэтым плане парламентам трэба сапраўды вельмі шмат папрацаваць над гарманізацыяй заканадаўства для таго, каб Зона свабоднага гандлю Малдовы і Беларусі паспяхова функцыянавала ва ўмовах Зоны свабоднага гандлю Малдовы і Еўрасаюза. Каб тут не было несанкцыянаванага руху тавараў, а ўсё служыла на карысць нашым краінам і народам.

Міхаіл Мясніковіч таксама заўважыў, што ў Беларусі і Малдове камфортна адчуваюць сябе нацыянальныя дыяспары, ёсць значныя поспехі ў навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, асабліва ў сферы сельскай гаспадаркі, у прыватнасці селекцыі. Акрамя таго, краіны з'яўляюцца вельмі важнымі гандлёвымі партнёрамі адна для адной.

Старшыня Савета Рэспублікі сказаў, што парламент Беларусі, які зараз працуе над уніфікацыяй заканадаўства ў рамках ЕАЭС, гатовы абменьвацца напрацоўкамі і з заканадаўцамі Малдовы, каб не давялося потым ісці на дадатковую гарманізацыю. «Магчыма, трэба разгледзець пэўныя ўзаемныя прэферэнцыі ў нашай гандлёва-эканамічнай сферы», — дадаў спікер.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** ў сваю чаргу запэўніў Прэзідэнта Мікалая Цімофці, што ў Беларусі з вялікай цеплынёй ставяцца да яго краіны і народа. «Вядома, мы спадзяёмся, што вельмі важныя дакументы, якія былі падпісаны напярэдадні, асабліва тое, што датычыцца пытанняў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, прамысловай кааперацыі, адкрыюць вялікія перспектывы для нашага далейшага супрацоўніцтва», — сказаў ён.

Спікер ніжняй палаты таксама дадаў, што ў беларускіх парламентарыяў склаліся вельмі добрыя адносіны з малдаўскімі калегамі: у 2012 годзе адбыўся афіцыйны візіт малдаўскай парламенцкай дэлегацыі ў Беларусь, было падпісана пагадненне аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве, летась кіраўнікі найвышэйшых заканадаўчых органаў дзвюх краін сустракаліся ў Санкт-Пецярбургу.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# НЕ ТОЛЬКІ ПАСКАРДЗІЦЦА, АЛЕ І ПАРАІЦЦА

**«Займацца» газіфікацыяй вуліцы, жыллёвымі пытаннямі, дапамагаць шукаць работу і нават выступаць у ролі міравога суддзі паміж варагуючымі бакамі давялося старшыні Мінаблвыканкама Сямёну Шапіру падчас выязнога прыёму грамадзян у Любанскім раёне.**

— Я ПРЫЙШОЎ не скардзіцца, а пагутарыць з вамі, Сямён Барысавіч, параіцца, — пачаў прымасціўшыся на краі крэсла, пажылы мужчына.

— Уладкоўваецеся, калі ласка, зручней, каб не зваліліся, — пажартаваў нехта.

Але пенсіянер не ацаніў жарт: «Я яшчэ моцны, дужы, маладым дам фору».

Мікалай Карпавіч працаваў у райсельгастэхніцы, потым, як сказаў сам, яго пераманілі ў райспажыўсаюз, развозіў хлеб па крамах. А нядаўна з ім не прадоўжылі кантракт. «Між іншым, я за рулём машыны яшчэ са службы на флоце: у Мурманску на «казле» вазіў камандзіра», — крыўдуе пенсіянер.

Мікалаю Карпавічу 75 гадоў. Відаць, найперш гэта і ўлічвала кіраўніцтва арганізацыі, калі прымала рашэнне. Але пенсіянер сцвярджае, што ў яго стае здароўя, сіл, каб працаваць далей. Маўляў, і зрок як у маладога, нават акуляры не носіць.

Сямён Шапіра спрабаваў упэўніць мужчыну, што ў такім узросце не зусім бяспечна вадзіць машыну. І прапанаваў старшыні райвыканкама разам з кіраўнікамі іншых арганізацый пашукаць для яго іншую работу, напрыклад слесара.

Ды пенсіянер стаяў на сваім: яму патрэбна месца толькі вадзіцеля. І нават запрасіў карэспандэнтаў праехацца з ім, каб упэўніліся, што лепш за яго ніхто не можа кіраваць «стальным» канём. Сапраўды, нічога не скажаш: Мікалай Карпавіч адчувае сябе за рулём як рыба ў вадзе. Але, магчыма, варта прыслухацца да парады кіраўніка вобласці...

ЯК кажуць, у кожнага свая праўда. У жыхара вёскі Канстанцінаўка — адна, у дырэктара Любанскага лясгаса — іншая.

Аляксандр Аляксандравіч лічыць, што да яго прадузята адносіцца кіраўніцтва: незаконна звольнілі за прагулы, якіх ён не рабіў. А яго кіраўнік сцвярджае, што з ім не прадоўжылі працоўныя адносіны пасля заканчэння тэрміну дзеяння кантракта. Разам з тым, дырэктар патлумачыў, што Аляксандр умее працаваць, але здзейсніў учынак, які не ўпрыгожвае яго як работніка і чалавека: выпісаў на сваю жонку 40 кубаметраў лесу нібыта для асабістых патрэб. Але, як стала вядома, перапрадаў драўніну юрыдычнай асобе.



Пасля таго, як з ім не прадоўжылі кантракт, былы работнік пачаў скардзіцца ў розныя інстанцыі, кантралюючыя органы. Шматлікія праверкі ствараюць у калектыве напружанне, а дзеянні былога калегі выклікаюць незадаволенасць у людзей.

— Аляксандр Аляксандравіч не меў прафесійнай адукацыі, але, як добрага працаўніка яго накіравалі на завочнае аддзяленне ва ўніверсітэт, — распавёў дырэктар.

Цяпер мужчына па рашэнні суда павінен вярнуць лясгасу сродкі, затрачаныя на вучобу. Грошы немалыя — 20 млн рублёў. Таму Аляксандр просіць растэрміноўкі.

Старшыня аблвыканкама параіў заключыць з ім дагавор на два-тры гады на вяртанне грошай за вучобу, але з умовай: у аднабаковым парадку яго скасаваць пры чарговай выхадцы. А жонцы Аляксандра, у якой закончыўся кантракт, папрасіў старшыню райвыканкама пасадзейнічаць з працаўладкаваннем.



Фота БЕЛТА.

Заяўнік, па ўсім відаць, застаўся задаволены. Ва ўсялякім выпадку ён падзякаваў Сямёну Шапіру за такое рашэнне і запэўніў, што асэнсаваў свае дзеянні.

НАТАЛЛЯ Анатольеўна са сваім мужам маюць невялікі гандлёвы павільён у цэнтры Любані. Яны займаюцца аказаннем бытавых паслуг насельніцтву. Але райвыканкам працягвае з імі дагавор арэнды на зямлю, дзе месціцца гандлёвы пункт, толькі на год. Афармленне дакументаў патрабуе і матэрыяльных затрат, і часу. Таму яны просяць пасадзейнічаць ім у тым, каб заключыць дагавор на некалькі гадоў.

Бясспрэчна, зразумець прадпрымальнікаў можна. Але і пазіцыю мясцовых улад —таксама. Яны хочуць засцерагчыся ад праблем, якія могуць узнікнуць у будучыні, калі тут пачнецца будаўніцтва жылога дома ці нейкага іншага аб'екта.

Сямён Шапіра даручыў райвыканкаму больш дэталёва разгледзець пытанне: «Калі людзі імкнуцца працаваць, то не трэба для іх ствараць перашкоды. Што тычыцца магчымага будаўніцтва на гэтым месцы, то варта прапісаць гэта ва ўмовах дагавора». Між іншым, кіраўнік цэнтральнага рэгіёна заўважыў, што часам мясцовыя ўлады баяцца прымаць самастойныя рашэнні, браць на сябе адказнасць. «Неабходна быць больш смелымі ў прыняцці канкрэтных рашэнняў, імкнуцца адносіцца да людзей з душой», — адзначыў ён.

НАТАЛЛЯ Сяргееўна з вёскі Песчанец выхоўвае чатырох непаўналетніх адна. З мужам развяліся: моцна выпіваў, за год выплаціў на дзяцей крыху больш за мільён рублёў аліментаў. Жанчына з малымі вымушана туліцца ў бацькоў. Маці працуе на ферме, дапамагае дачцэ і маральна, і матэрыяльна. Але бяда ў тым, што бацька сябруе з бутэлькай, часта ладзіць сваркі. Наталля супраць, каб такі прыклад быў перад вачыма яе дзетак, таму і хоча «аддзяліцца». Але куды? Сямён Шапіра даручыў старшыні райвыканкама разгледзець розныя варыянты і дапамагчы маладой маці абзавесціся ўласным кутком.

Усяго старшыня аблвыканкама выслухаў 14 скаргаў. Некаторыя жыхары прыйшлі на прыём нават сем'ямі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# У АКВАПАРК — БЕЗ ІНСТРУКТАЖУ...

**Завяршылася пракурорская праверка па факце гібелі школьніцы з Драгічынскага раёна. У дачыненні да настаўнікаў завялі крымінальную справу.**

Нагадаю, трагедыя ў Кобрынскім аквапарку адбылася 12 чэрвеня. Там адпачывала група з 20 вучняў Завершанскай базавай школы ў суправаджэнні двух настаўнікаў. З дна басейна 7-гадовую дзяўчынку дастаў наведвальнік аквапарка з Мінска. За жыццё другакласніцы ў Брэсцкай дзіцячай абласной бальніцы змагаліся амаль два тыдні...

— Падазраванымі па факце гібелі дзяўчынкі праходзяць два настаўнікі Завершанскай школы Драгічынскага раёна, якія суправаджалі групу дзяцей, — падзяліўся вынікамі праверкі **пракурор Брэсцкай вобласці Іван НАСКЕВІЧ**. — Устаноўлена, што перад наведваннем аквапарка не быў праведзены інструктаж аб выкананні мер бяспекі, не высветлена, ці ўмеюць вучні плаваць. У ваду былі допушчаны некалькі школьнікаў без пісьмовага дазволу бацькоў, выхавальнікі не заўсёды сачылі за дзецьмі. Мы таксама зрабілі выснову, што з боку адміністрацый аквапаркаў у недастатковай ступені прымаюцца меры па забеспячэнні бяспекі наведвальнікаў. Неабходна заканадаўча ўрэгуляваць правілы паводзінаў пры наведванні падобных устаноў.

Незадоўга да трагедыі ў Кобрынскім аквапарку пракуроры вобласці распачалі праверкі дзіцячых дваровых пляцовак і паркаў, паветраных атракцыёнаў, аздараўленчых лагераў. Паводле слоў Івана Наскевіча, недахопы — практычна паўсюдна.

— Падчас праверак у паркавых зонах выявілі атракцыёны, якія ўжо 20 гадоў таму павінны былі быць зняты з эксплуатацыі. Уяўляеце, якія могуць быць наступствы? Ці як можна дапусціць, каб у двары знаходзіліся малыя архітэктурныя формы, з якіх тырчыць арматура? — задае рытарычнае пытанне пракурор вобласці.

Па патрабаванні пракурораў прыняты меры па дэмантажы гульнявога абсталявання або прывядзенні яго ў належны стан у дварах жылых дамоў у Брэсце, Ганцавіцкім, Драгічынскім, Брэсцкім, Івацэвіцкім раёнах, на тэрыторыі дашкольных устаноў у Брэсцкім і Іванаўскім раёнах, у дзіцячых аздараўленчых лагерах у Маларыцкім і Ляхавіцкім раёнах, у парках Пінска, Драгічынскага і Лунінецкага раёнаў.

— Вядома, важна не толькі займацца ліквідацыяй атракцыёнаў, якія не адпавядаюць патрабаванням бяспекі, але і будаваць новыя, — дадаў Іван Наскевіч. — Гэта абавязак мясцовых органаў улады. Мы прадпісваем ім гэта. Але тое, што можа стаць прычынай гібелі дзяцей (на жаль, такія выпадкі маюцца, хоць і не ў нашай вобласці), пракуроры не дапусцяць да эксплуатацыі.

**Надзея ПАЎЛАВА**

■ Футбол

# УСЁ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ

**Нічыя і мінімальнае паражэнне. Менавіта такія вынікі прынеслі першыя матчы другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы з удзелам салігорскага «Шахцёра» і мінскага «Дынама».**

Салігорцы на сваім полі прымалі аўстрыйскі «Вольфсбергер». Гэта на першы погляд можа падацца, што назва каманды нічога не кажа, а калі падрабязна прааналізаваць выступленні клуба за апошнія гады, разумееш: апанент у «Шахцёра» сур'ёзны. Што казаць, калі аўстрыйцы нядаўна ў таварыскіх сустрэчах перайгралі славуты нямецкі «Шальке-04» і даволі моцны расійскі «Краснадар». Але беларусы годна глядзеліся на фоне саперніка. Як пасля сустрэчы прызнаўся **Юрый ВЯРГЕЙЧЫК, дырэктар «Шахцёра»**, каманда наогул правяла найлепшы першы тайм за апошнія паўгода. У другой палове «жоўта-чорныя» ўсё ж такі прапусцілі, але ўсё насамрэч вырашыцць матч у адказ. Як сказаў Сяргей Нікіфарэнка, галоўны трэнер «Шахцёра», шанцы яшчэ застаюцца роўнымі, трэба выкарыстаць моманты, якія будуць у каманды.

Паралельна з «Шахцёрам» у балгарскім гарадку Разград гулялі сталічныя «дынамаўцы». Хатні стадыён каманды «Чорна мора» забракавала УЕФА, а таму матч давялося праводзіць на арэне «Лудагорца», чэмпіёна краіны. У гэтай сустрэчы ў мінчан галявых момантаў было няшмат, але яны скарысталіся тым, што мелі. Пры лічбах на табло 1:0 на карысць гаспадароў ударам галавы лік зраўняў Сяргей Паліцевіч.

Сумныя баўгары адразу пасля сустрэчы пачалі казаць аб сваёй перавазе.

— Я ўпэўнены, што нам па сілах прайсці «Дынама», — сказаў Нікола Спасаў, галоўны трэнер «Чорна мора». — Адправімся ў Мінск гуляць на перамогу.

Пры гэтым ён усё ж такі прызнаў, што «на паперы «Дынама» фаварыт супрацьстаяння». А вось глаўкам «Дынама» Вук Рашавіч прызнаўся, што задаволены вынікам. Паглядзім, што будзе далей. Паўторныя матчы пройдуць на наступным тыдні. У іх усё і вырашыцца.



Як гулялі каманды з постсавецкай прасторы ў другім кваліфікацыйным раўндзе Лігі Еўропы. «Кайрат» (Казахстан) — «Алашкерт» (Арменія) — 3:0, «Елгава» (Латвія) — «Работнічкі» (Македонія) — 1:0, «Дачыя» (Кішынёў) — «Жыліна» (Славакія) — 1:2, «Сконта» (Латвія) — «Дэбрэцэн» (Венгрыя) — 2:2, АІК (Швецыя) — «Шырак» (Арменія) — 2:0, «Апалон» (Кіпр) — «Тракай» (Літва) — 4:0, «Вадуц» (Ліхтэнштэйн) — «Ныме Калью» (Эстонія) — 3:1, «Вайводзіна» (Сербія) — «Спартак» (Юрмала, Латвія) — 3:0, «Чукарычкі» (Сербія) — «Габала» (Азербайджан) — 1:0, «Хафнаф'ёрдур» (Ісландыя) — «Інтэр» (Азербайджан) — 1:2.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*
**Фота прэс-службы ФК «Дынама-Мінск»**


**К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле, который состоится 30 июля 2015 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 26 июня 2015 г.) добавляется лот № 6 в следующей редакции:**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь га | Целевое назначение | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | на территории Центрального пляжа г. Гомеля | 340100000001005880 | 0,3799 | Для организации платной зоны отдыха (земельный участок рекреационного назначения) | Охранная зона прибрежных полос водных объектов – 0,3799 га | 5 | 24 910 287 | 4 982 057 | 22 383 335 |

Лот № 6 выставляется на аукцион повторно, извещение опубликовано 27 мая 2015 года в газете «Звязда».
**Контактный телефон: 41-97-86. Наш сайт – www.gorod.gomel.by**
УНП 400230163


■ Добрая навіна

# Ваўкавыск запрашае на свята

### Горад сёння адзначыць 1010-годдзе лазерным шоу і феерверкам

**Ваўкавыск загадзя рыхтаваўся да свята, пра што паведаміў начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дзмітрый ЗЯЗЮЛЯ.**

Некалькі дзён таму быў усталяваны памятны знак у гонар атрымання горадам магдэбургскага права. Вялікі валун з выбітым на ім гістарычным гербам горада ў выглядзе галавы ваўка ўпрыгожыў пляцоўку перад будынкам райвыканкама. Учора ў скверы воінаў-інтэрнацыяналістаў быў адкрыты манумент у гонар мужнасці і гераізму, праяўленых удзельнікамі баявых падзей і лакальных войнаў XX стагоддзя. Работы па ўсталёўцы невялікага мармуровага пастамента са званом завершаць добраўпарадкаванне сквера.

Падчас святкавання будзе арганізавана выстава матацыклаў мясцовага клуба аматараў мотатэхнікі, фотавыстава. Пройдуць кірмашы вырабаў народных майстроў і святочны гандаль, адбудуцца паядынкі па гульнявых відах спорту, можна будзе пакатацца на конях. Жыхароў і гасцей горада парадуе ў гэты дзень сваімі выступленнямі Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Цітовіча, хор свяшчэннаслужыцеляў Гродзенскай епархіі, а таксама артысты з Тальяці, якія спецыяльна прыехалі на юбілей: ансамбль беларускай песні «Купалінка» грамадскага аб'яднання «Беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія «Нёман» і харэаграфічны ансамбль «Ліцэй» дзіцячай школы мастацтваў.

Познім вечарам свята перамесціцца на стадыён СДЮШАР №1. Там пройдзе музычны фестываль EDM Explosion, арганізатары якога абяцаюць не толькі якасную музыку, але і лазернае і фаер-шоу. Завершыцца свята феерверкам.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ**

НАВІНЫ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ.

## АЎГУСТОЎСКІ МАРАФОН

**Ёсць спраўны веласіпед і ахоўны шлем? Тады можна не толькі выпрабаваць сябе як веласіпедыста, але і атрымаць асалоду ад знаходжання ў маляўнічых прыродных мясцінах у раёне беларускай часткі Аўгустоўскага канала — са зменай ландшафту, спускамі і пад'ёмамі.**

Скарыстацца такой магчымасцю прапануюць усім ахвотным арганізатары ўжо традыцыйнага веламарафону «Суседзі», які адбудзецца 18 ліпеня. Зоны старту і фінішу будуць размешчаны каля шлюза Дамброўка.

Папулярнасць веламарафону з кожным годам узрастае. Чакаецца, што сёлета ў ім паўдзельнічаюць каля тысячы чалавек — не толькі нашых землякоў, але і гасцей з Польшчы, Расіі. Галоўны суддзя спаборніцтваў Іван Найдзёнаў паведаміў, што ўдзельнікам (у некалькіх узроставых групах) прапануюць на выбар чатыры трасы — згодна з іх падрыхтоўкай. Дыстанцыя працягласцю 60 кіламетраў прызначана для найбольш вопытных веласіпедыстаў. Паўмарафон — 40 кіламетраў, міні-марафон — 10. А для дзяцей да шасці гадоў падрыхтавалі спецыяльную двухсотметровую трасу.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## ГРОШЫ ПАЦЯКЛІ ПА ШОЎКУ

**Камерцыйны банк выпусціў міжнародную картку «БЕЛКАРТ-Maestro» з сімволікай слуцкіх паясоў.**

Новая кабэйджынгавая картка Беларускага народнага банка дазваляе кліентам выкарыстоўваць усе перавагі нацыянальнай і міжнароднай плацежнай сістэмы, аплачваць тавары і паслугі ў Беларусі і за мяжой, а таксама ў інтэрнэце, здымаць наяўныя грашовыя сродкі ў банкаматах. Картка выпускаецца з чыпам у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да бяспекі і надзейнасці правядзення плацяжоў.




У аснове дызайну карткі — матывы знакамітых слуцкіх паясоў, гістарычнага і культурнага сімвала, выдатнага ўзору дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, аднаго з сучасных брэндаў Беларусі. Відавочна, што выбар такога афармлення звязаны з феноменам слуцкіх паясоў, якія з'яўляюцца вынікам ўзаемадзеяння культур. Ідэя прыйшла ў нашу краіну з усходу дзякуючы захапленню беларускай шляхты гісторыяй сарматаў. Можна лічыць, што паясы сталі міжнароднай звязкай, а цяпер будуць сімвалізаваць міжнародныя магчымасці аплатнай карткі. Цікава, што Беларускі народны банк збіраецца развіваць супрацоўніцтва з БЕЛКАРТ. У хуткім часе чакаецца выпуск новай карткі з сімвалічнай назвай «White Card».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.** *kuletski@zviazda.by*

## ДАДАТКОВЫ ШАНЦ

**Прыём дакументаў на бюджэтную форму навучання ў дзяржаўных ВНУ завяршыўся, але ў добра падрыхтаваных абітурыентаў яшчэ ёсць магчымасць атрымаць прэстыжную спецыяльнасць без прыцягнення фінансавых сродкаў.**

Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО» трэці год запар прадастаўляе месцы з правам бясплатнага навучання для самых паспяховых абітурыентаў, якія паступаюць на дзённую форму атрымання адукацыі. У бягучым годзе ў Мінску выдзелена 80 бясплатных месцаў і па 15 — у філіялах універсітэта ў Гомелі і Віцебску. Прэтэндаваць на іх могуць абітурыенты, якія набралі ў суме больш як 250 балаў (за тры сертыфікаты ЦТ і атэстат).

Паколькі гэта не бюджэтныя месцы, абавязковага размеркавання пасля заканчэння вучобы не будзе. Аднак права вучыцца бясплатна студэнтам давядзецца штогод пацвярджаць. Калі паспяховасць студэнта-бясплатніка з нейкіх прычын зніжаецца, магчымасць бясплатнага навучання пераходзіць да іншага студэнта, які дэманструе больш высокі ўзровень ведаў.

Дакументы ад прэтэндэнтаў на бясплатнае навучанне будуць прымацца ў МІТСО да 2 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ЗЛАЧЫНЕЦ НАПАЎ НА ЛАГЕР

**Нядаўна ў дзіцячым лагеры «Арляня», што непадалёк ад Гродна, невядомы ноччу пранікнуў у хлапечы пакой з сексуальнымі намерамі. На шчасце, на шум адрэагавала выхавацель, якая ўвайшла ў памяшканне. Мужчына ўцёк. Дзеці не пацярпелі, але вельмі моцна спужаліся.**

Пракуратура Гродзенскай вобласці праводзіць праверку па дадзеным факце, Следчы камітэт рэгіёна распачаў крымінальную справу. Здарэнне вымусіла прыняць меры і выканаўчыя органы — уведзена практыка пазапланавых выездаў і рэйдаў у дзіцячыя лагеры, ва ўстановах дзіцячага адпачынку на начныя дзяжурствы заступаюць супрацоўнікі і міліцыянеры.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## КРАДЗЕЖ НА ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ

**У Мінску затрымалі дзяўчыну, якая ў свой дзень народзінаў вырашыла зрабіць сабе сумніўны падарунак — прысвоіла чужыя грошы.**

Як паведаміла прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС сталіцы Таццяна Абозная, прычынай крадзяжу стала... далікатнасць маладога чалавека. Два хлопцы ў скверы па праспекце Незалежнасці пазнаёміліся з трыма дзяўчатамі. Працягнулі знаёмства ў кавярні, а пасля вырашылі прагуляцца на свежым паветры. Было холадна, і адзін з хлопцаў прапанаваў імяніннцы сваю куртку. Пазней дзяўчына паведаміла, што ёй з сяброўкамі трэба адысці. У выніку хлопец больш не ўбачыў не толькі дзяўчат, але і сваіх грошай — амаль двух мільёнаў рублёў.

Асобу мінчанкі аператыўна высветлілі. У дачыненні да яе заведзена крымінальная справа. Няўдачлівай злачынцы пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

■ Падпіска-2015

# СА «ЗВЯЗДОЮ» — ЛЕТА Ў РАДАСЦЬ! І НЕ ТОЛЬКІ ЯНО

**...І смех і грэх, што называецца: прыяцелька абнову справіла — светлыя нагавічкі купіла, айчыннай вытворчасці, з натуральнага лёну. І селі хораша, як на яе пашытыя... Назаўтра ж прыбралася.**

**Па горадзе (потым расказвала) вельмі горда ішла. Яшчэ б: на яе з цікавасцю паглядалі мужчыны!.. А на ўсе зайздросныя позіркі жанчын ёй нават адказаць хацелася — кароткім: «Купляйце беларускае!» Будзеце і вы вось так выглядаць!»**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Аднак, на жаль, нядоўга яна фарсіла: прыехала на працу, зайшла ў ліфт, глянула на сябе ў вялікае люстэрка і ледзь не самлела: маланка на тых нагавічках па-здрадніцку «разышлася», яна (як потым аказалася) і не думала трымацца...

Нейкая замежная пакупніца (не вам казаць) тут жа панеслася б у краму, падняла б вялікі вэрхал, нават папрасіла б кампенсацыі за маральныя страты... Наша, тутэйшая, — цяжанька ўздыхнуўшы, з дапамогай манікюрных «кусачкаў» падціснула на той маланцы «сабачку» — і ўсё ў парадку. Адно шкада было — добрага настрою ды радасці ад пакупкі. Пра што прыяцелька, як чалавек дасведчаны, тут жа напісала вытворцам. Бо гэтага ж грэх цяпер не рабіць: ці не ў кожнага з іх — апроч паштовага адраса — ёсць сайт, заходзь, калі што — хвалі, крытыкуй, прапаноўвай... Гэта, заўважым, вельмі важна для ўсіх, хто стараецца нешта рабіць, і патрэбна, у тым ліку — рэдакцыі газеты.

«Чытачом «Звязды», яе шчаслівым падпісчыкам я з'яўляюся каля трыццаці гадоў, — піша **настаўніца Навасёлкаўскай сярэдняй школы з Пастаўшчыны Таццяна САРОКА**. — Двойчы за гэты час выйгравала ў звяздоўскай латарэі. Адзін раз мне пашчасціла на прас, другі — на вялікі чырвоны парасон. Дзякую газеце за клопат, за прыемныя моманты ў маім жыцці. Але ж яны бываюць не толькі тады, калі нешта выйграеш. Іх перажываеш заўсёды, калі разгортваеш чарговы нумар газеты, калі чытаеш, нешта пазнаеш, бярэш сабе на заметку, а то і проста адпачываеш. Бо газета цікавая многім. Тым, па-першае, што яна на роднай мове, тым, што тут шмат цікавых рубрык, тым, што кожны выпуск рыхтуюць прафесіяналы. Пра падзеі на нашай Віцебшчыне піша Аляксандр Пушканскі, заўсёды чакаю і чытаю «Фотасловы» Яўгена Пясецкага. Некалі на свяце «Звіняць цымбалы і гармонік» мела шчасце пазнаёміцца з Анатолем Клешчуком. Ён вельмі шчыры чалавек, вельмі добразычлівы і вельмі цікавы ўсім, што робіць. Як, дарэчы, і іншыя звяздоўцы — Алена Ляўковіч, Валянціна Доўнар, Ларыса Цімошык, Святлана Яскевіч, Сяргей Расолька...

Думаю, за гэта і любяць людзі «Звязду». Шмат у ёй цікавага для моладзі, шмат — для сталых людзей (мая мама з цікавасцю яе чытае). Да таго ж газета мне патрэбна ў працы, у школе, на інфармацыйных гадзінах для вучняў. Нехта патрэбную інфармацыю шукае ў інтэрнэце, а я «зноў выбіраю «Звязду». Мне гэта бліжэйшае. Магчыма, праз мову, магчыма, праз тое, што і сапраўды «ўсіх тут ведаеш»? А магчыма, проста прывыкла?»

«Каторы год ужо пяць разоў на тыдзень, — чытаем у лісце **спадара Леаніда ЛЕБЕДЗЕВА** з Оршы, — я спяшаюся на сустрэчу з «маёй «Звяздой». Чым яна прывабіла? Найперш — любоўю да чытачоў, тым, што яна, як блізкі чалавек, імкнецца прыйсці на дапамогу, нешта параіць у нялёгкіх жыццёвых абставінах. І людзі кіруюцца гэтымі парадамі, яны давяраюць газеце — часам самыя патаемныя думкі.

Вось таму і чакаеш кожны новы нумар, вось таму і чытаеш пра падзеі ў краіне і свеце, разам з журналістамі развaжаеш над жыццёвымі нягодамі, над праблемамі, якія чакаюць пакуль свайго вырашэння.

Вельмі радуе, што газета заўсёды ў пошуку, што яна пастаянна адкрывае новыя рубрыкі і праекты, якія не могуць не зацікавіць, якія будзяць душу і дапамагаюць асэнсаваць сваю гісторыю, убачыць беларускасць у сваім штодзённым побыце. Здаецца, нічога асаблівага не піша Сяргей Расолька: расказвае пра тое, як некалі нарыхтоўвалі дровы, як калолі кабана, якая была мода. Але ж дзівадзіўнае: чытаеш — і прыходзіць душэўны спакой... Магчыма, таму што ў расповедзе пра такія простыя рэчы паказана прыгажосць душы беларуса, яго працавітасць і маральная ўстойлівасць, паказана нешта нябачнае, што яднала і трымала сям'ю тады і не заўсёды, на жаль, трымае цяпер.

З цікавасцю чакаю артыкулы Святланы Яскевіч, Алены Ляўковіч, Аляксандра Пукшанскага, Барыса Пракопчыка, тэматычныя старонкі «Жырандоля», «Глыбінка», «Сямейную газету»... І тады шчыра шкадую, што не ўсе чытаюць газету, не ўсе могуць адчуць прыгажосць нашай мовы і повязь пакаленняў...»

«Шчыра скажу, — піша **спадар Валерый ГАЎРЫШ з Чавусаў**, — апошняя падпіска на «Звязду» ледзь не сарвалася. У мяне, як на тое ліха, скончыліся неабходныя лекі, у госці прыехала трое ўнукаў, а падпісацца ж хацелася адразу на квартал, каб мець надзею яшчэ і на прыз (бо адзін раз у звяздоўскай латарэі мы выйгралі сем трубак шпалераў, другі — кухонную машыну)... Так што прыйшлося падумаць і ўсё ўзважыць. Але ўрэшце, любоў да газеты ўзяла сваё: мы зноў падпісаліся — «выбралі «Звязду»...»

Як і (каторы ж раз з 1969 года?) спадар Леанід Красоўскі з Бярэзіншчыны, сужэнцы Валянціна і Аркадзь Грушко з Рэчыцы, Рыгор Скіндзер з Івацэвіччыны, Аліна Пахвалённая і Сцяпан Ляшчэнка з Мінска і многія, многія іншыя, хто ў рэдакцыю напісаў пра гэта і не напісаў, але ў чарговы раз падпісаўся на «Звязду», хто даслаў альбо не даслаў картку на розыгрыш прызоў.

...Днямі ў сценах рэдакцыі ён адбыўся. Паводле правілаў, спачатку ў чароўны капялюш былі складзены ўсе карткі, дасланыя нашымі падпісчыкамі з Брэстчыны, потым — Віцебшчыны, Гомельшчыны, Гарадзеншчыны, Магілёўшчыны, Міншчыны і самой сталіцы.

Па адной, самай шчаслівай, з кожнай вобласці і горада Мінска выцягнулі нашы госці, таксама падпісчыкі «Звязды» Аліна Пахвалённая і Сцяпан Ляшчэнка (на здымку). Пасля гэтага быў разыграны суперпрыз. У выніку

**ПАДВЕСНЫЯ КРЭСЛЫ-ГАМАКІ CARINA ВЫЙГРАЛІ:**

**Вікенцій Іванавіч Мароз (в. Даманава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці);**

**Веньямін Іванавіч Хацілові (г. Глыбокае Віцебскай вобласці);**

**Алена Уладзіміраўна Крацік (г. Гомель);**

**Ніна Іванаўна Суран (в. Горная Рута Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці);**

**Зоя Іванаўна Самец (г. Клічаў Магілёўскай вобласці);**

**Валерый Міхайлавіч Трухноў (г. Мядзел Мінскай вобласці);**

**Уладзімір Віктаравіч Шулякоўскі (г. Мінск).**

**СУПЕРПРЫЗ — АРЭЛІ MELODY — ВЫЙГРАЛА**

**Эмілія Іванаўна Васілевіч, г. Мінск.**

Віншуем шчаслівчыкаў! І, як заўсёды, трохі смуткуем — разам з тымі, хто спадзяваўся на выйгрыш, аднак...

Калі ласка, не засмучайцеся. Хаця б таму, што, прыз той не выйграўшы, вы нічога не прайгралі: падпісаліся, значыць, да вас цягам месяца, квартала ці паўгоддзя пяць разоў на тыдзень будзе прыходзіць ваша газета. Да таго ж не за гарамі новая падпіска, новы розыгрыш, новыя прызы. Магчыма, вашы?

А пакуль, у завяршэнне гэтага кароценькага агляду, радкі, якія раней даслаў у рэдакцыю спадар Георгій Шундрык з Дзятлава:

*Газета на маім стале...*
*Заўжды — і летам, і зімою,*
*Як малады быў, як сталеў,*
*Не расставаўся са «Звяздою».*

*Сную падчас туды-сюды,*
*Майструю штось, перажываю...*
*Прысяду ж да сваёй «Звязды»*
*І з ёй душой адпачываю.*

Так было? Няхай жа так і будзе!

**Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

**P.S.** Трэба дадаць, што на адрас рэдакцыі, ну вядома ж, прыходзяць не толькі лісты-кампліменты. У асобных ёсць справядлівая крытыка, ёсць слушныя прапановы і заўвагі, ёсць цікавыя падказкі і просьбы. Многія з іх, што называецца, «бяруцца на ўзбраенне», што, урэшце, адбіваецца як на змесце, так і на знешнім выглядзе газеты, якая без малога сто гадоў жыве жыццём сваёй краіны. Ці не так?

**Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 284 44 04**

Афіцыйна: арганізатарам рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — лета ў радасць!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэкламная гульня «Са «Звяздою» — лета ў радасць!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 25.05.2015 (пасведчанне № 2568) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 чэрвеня па 30 верасня 2015 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» трэцяга квартала або другога паўгоддзя 2015 года.

Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 213 падпісчыкаў.

# ГЛЯДЗЕЦЬ ВА ЎСЕ ВОЧЫ

## ГУЛЬНЯ СА СВЯТЛОМ І ТРУКІ ПРАСТОРЫ

У тых выпадках, калі сама кватэра цёмная, то сустрэчу з кліентам вопытныя рыэлтары прызначаюць раніцай ці ўдзень. Аднак, калі становішча дома зусім нявыйгрышнае, тады гасцей прымаюць вечарам. Гэта той выпадак, калі асвятляльныя прыборы павінны працаваць на поўную магутнасць. Вельмі да месца ў самым цёмным кутку паставіць таршэр або настольную лямпу. І наогул, правільнае асвятленне дапамагае стварыць у кватэры не толькі патрэбную атмасферу, але і схаваць недахоп натуральнага святла. Да таго ж адлюстраванае ад сцен, падлогі і столі святло электрапрыбораў дапамагае пакупніку «правільна» ацаніць памеры памяшкання.

Вялікае люстэрка візуальна павялічвае прастору, асабліва калі знаходзіцца насупраць дзвярэй, бо яно дабаўляе плошчы памяшканню за кошт суседняга пакоя. Люстэрка размешчанае насупраць акна адразу робіць жыллё святлейшым.

## МУЖЧЫНЫ БАЧАЦЬ... НОСАМ

Неверагодна, але нават пах можа паўплываць на рашэнне «купляць ці не купляць». Таму вопытныя людзі ведаюць, што будзе лепш, калі на момант паказу кватэры ў доме прапішуцца не пахі хатніх жывёл, затхласці або цыгарэт, а будзе лунаць мяккі водар смажанай бульбы або свежазваранай кавы. Пах карыцы або ванілі таксама ўздзейнічае заспакаяльна, і ў першую чаргу на мужчын. Падобных прыёмаў і хітрыкаў хапае. Тут галоўнае іх своечасова заўважыць і не «папльгць».

## БАБУЛІ НЕ ПАДМАНУЦЬ

А яшчэ будучаму ўласніку неабходна абавязкова звярнуць увагу на від з вокнаў, каб ацаніць тэрыторыю побач з домам. Пры аглядзе кватэры лепш не ленавацца і зазірнуць пад падлогавае пакрыццё. Абавязкова пераканайцеся ў адсутнасці



Такую кватэру ніхто не купіць

свежапафарбаваных падцёкаў на століі ў кутках, праверце стан электраправодкі, сантэхнікі, а таксама ці нармальна адчыняюцца вокны і дзверы.

Не трэба адмаўляцца ад інфармацыйнай разведкі на мясцовасці. Яе можна ажыццявіць праз механізм шчырай гутаркі з бабулямі на лавачцы ля пад'езда. Яны абавязкова раскажуць пра ўсіх праблемных суседзяў, пра гісторыю вашай патэнцыяльнай кватэры і ўвогуле шмат чаго цікавага, пра што і гаспадары, і рыэлтары за найлепшае палічаць проста не згадваць.

## АДШУКАЦЬ ПЕРАПЛАНІРОЎКУ

Перад прыняццем канчатковага рашэння неабходна на халодную галаву скрупулёзна перачытаць усе жыллёвыя дакументы. Параўнайце задэклараваныя прадаўцом метраж і планіроўку кватэры з тэхпашпартам. Калі ў кватэры праведзена перапланіроўка, абавязкова праверце, ці ўзаконена яна, інакш вам не пазбегнуць сур'ёзных праблем у будучыні. І галоўнае, не трэба рабіць такія сур'ёзныя крокі спантанна, пад уздзеяннем асабістай сімпатыі. Папярэдне ўладальнік можа быць і сапраўды цудоўным чалавекам, але... Яму галоўнае прадаць, а рыэлтару — правільна арганізаваць і правесці здзелку. А жыць у кватэры будзе новы гаспадар.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ПАРАДА РЫЭЛТАРА

**Адзін мой знаёмы работнік агенцтва нерухомасці распавёў пра хітрыкі прадаўцоў, пасля якіх узнікаюць праблемы як у пакупнікоў, так і ў рыэлтараў. Гэта даўгі за «камуналку». Пра падобныя запазычанасці, што вісяць на кватэрах, арганізатары здзелкі звычайна інфармуюць будучых гаспадароў або патрабуюць іх пагасіць. Аднак здараюцца выпадкі, калі бягучай запазычанасці кватэра не мае, а існуюць даўгі па аплаце за камунальныя паслугі за папярэднія гады. Адразу такія даўгі без дасканалай праверкі і не ўбачыш. Між іншым, іх памеры могуць дасягаць 10 млн рублёў і нават больш. Таму ў першую чаргу перад тым, як падпісваць дакумент аб куплі кватэры, зусім не пашкодзіць наведаць мясцовы разліковы цэнтр ЖЭСа і даведацца пра ўсе падводныя камяні вашага будучага жылля.**

■ Зямельны рэкорд

# СОТКІ — ПА КОШЦЕ ЭЛІТНАГА ЖЫЛЛЯ

Ірына Кадзюкова пачала цікавіцца мультыплікацыяй пасля таго, як убачыла на тэлебачанні сюжэт пра тое, як рабіць анімацыйныя стужкі. Тады яна і зразумела, што нічога на свеце больш не хоча так моцна, як размалёўваць пэндзлем карцінкі. Але вучылася Кадзюкова не на аніматара. Адразу яна паступіла на журфак БДУ, пасля першай напісанай нататкі «зразумела, што лепш журналістыкай не займацца, і пайшла на філфак атрымліваць самую «небалючую» адукацыю». Дарэчы, цяпер дзякуе філфаку за тое, што яна адна з нешматлікіх аніматараў, якія пішуць пісьменна. Адначасова Ірына займалася анімацыяй. Лічыць, што ёй мог бы пазайздросціць сам Пікасо, бо ў мультыплікатараў «малюнак яшчэ і рухаецца».

«Аніматары не падобны да іншых кінематаграфістаў. Тут трэба шмат працаваць, патрэбен гумар. Гэтая прафесія адштурхоўвае дрэнных і сумных людзей. Таму атрымліваецца кола тых, дзе ўсе адзін за аднаго радуюцца. Мова анімацыі сумяшчае ў сабе ўсе віды мастацтва. Мяне просяць даць азначэнне анімацыі, а яго няма!» — распавядаючы пра свой мультыплікацыйны вопыт, Ірына тлумачыць, як гэтае мастацтва зачароўвае. Напрыклад, Хаяо Міядзакі палюбіў анімацыю, убачыўшы «Снежную каралеву», якой ужо 60 гадоў. У Юрыя Нарштэйна мультфільм «Ліса і заяц» пачаўся з паху свежага снегу, а знакаміты «Вожык у тумане» — з гуку сухога лістка, які падае.



Сястра і брат.

## СУКЕНКА ДЛЯ «ШАПЭНА»

Анімацыя жыве вельмі доўга. Кадзюкова кажа, што найлепш за ўсё гэта разумееш, калі будзеш глядзець мультфільмы, якія глядзеў са сваімі бацькамі ў дзяцінстве, з уласным дзіцем. Анімацыя проста не можа памерці, бо гэта нітка, якая звязвае. Яна звязвае пакаленні, прымушае паслядоўнікаў, якія будуць займацца мультыплікацыяй, любіць тое, што было зроблена да іх. Таму такі поспех у старога, добрага «Вожыка ў тумане» ды «Снежнай каралевы», якую проста немагчыма параўноўваць з сучаснымі «Снежнымі каралевамі»: яны — гэта, хутчэй, спробы, халодныя клішэ без усялякіх сюрпрызаў і «грацыі памылкі». А тая, колішняя «Снежная каралева», — сапраўдны шэдэўр. Але цяпер набірае папулярнасць такая форма фестывальнага кіно, як «новае — гэта даўно забытае старое»: тэхналогіі, якія робяцца рукамі. І чым больш відаць, што гэта зроблена рукамі, чым больш грубасці, а не «камп'ютарнай гладкасці», тым большую цікавасць выклікае стужка.

«Тэхналогіі робяць многія фільмы падобнымі», — кажа Ірына. І сапраўды, колькі ўжо ў свеце гэтых аднатыпных мультфільмаў, якія не змогуць навучыць дзяцей чамусьці добраму, а толькі паказваюць нейкія спрэчкі ды бойкі. Можа, і добра, што «Шрэка» ў беларускай анімацыі не будзе ніколі».

Здаецца, у анімацыі галоўнае — выявы, але тут важнымі з'яўляюцца і словы. Ірына Кадзюкова любіць фільмы, якія «гавораць», нягледзячы на тое, што не ўсё паддаецца словам. «Калі ўсё можна пераказаць, калі ўсё пойдзе ў словы — навошта тады здымаць? Здымаць трэба тады, калі ёсць штосьці, што не паддаецца словам, але і гэта не значыць, што ўсё атрымаецца». Яна, як філолаг, любіць стужкі, якія гавораць і маюць сюжэт — у гэтым павінна быць гармонія.

Гэтая жанчына жыве сваёй працай — «рэжысура ва ўсім». Калі яна працавала над «Шапэнам», які прынёс мультыплікатару намінацыю на «Залатога арла» (расійскі «Оскар»), то, скончыўшы працу над стужкай, Кадзюкова «адчувала сябе крыху ўдавой» — гэта ўсяго некалькі хвілін экраннага часу, а колькі працы, колькі сябе яна аддала гэтаму фільму! Але калі збіралася на цырымонію ўзнагароджання, то купіла прыгожую доўгую сукенку любімага колеру Шапэна. «Гэта было ў павільёнах «Масфільма», што сімвалічна, таму што я дэбютавала ў рэжысуры менавіта там. Я памятаю, як на маёй дэбютнай працы разгортваецца знакаміты надпіс «Масфільм». Гэта вельмі дорага мне. І я ішла ў фіялетавай сукенцы па калідорах, не верыла, што тое са мной адбываецца. Я не атрымала статуэтку. У зале я напісала сыну, што «арол» не наш. Ён адказаў, што гэта добра, бо яго ўсё роўна няма дзе паставіць. Насамрэч, я на той момант ужо шмат узнагарод атрымала».

Ірына расказвае быццам бы пра кіно, а насамрэч — пра жыццё, вяртаючы некаторыя яго імгненні. Вось так, вяртаючы імгненні, Кадзюкова стала знакамітым мультыплікатарам і рэжысёрам, не заўважыўшы гэтага. Гэтая жанчына неверагодна самакрытычная, кажа, што ёй заўсёды страшна на праглядах сваіх стужак, нават калі яна атрымлівае за іх узнагароды: «Фільмам заўсёды не задаволена. Цябе могуць узнагароджваць чым заўгодна, а ты будзеш плакаць аб тым, што ты не змог зрабіць. Таму што іншыя бачаць тое, што зроблена, і толькі ты плачаш аб тым, што не зроблена, што магло б атрымацца. А тое, што зроблена, цябе мала цікавіць».

## ЭМАЦЫЙНАЯ СКАРБОНКА

Беларусі было наканавана стаць не тое, каб сталіцай анімацыі, але даць шмат прафесіяналаў гэтай справы. Першая анімацыя Юрыя Нарштэйна была зроблена на «Беларусьфільме». Яна была ўключана ў фільм Уладзіміра Бычкова «Увага! У горадзе чараўнікі!», дзе таксама здымалася Ірына Кадзюкова. Праз колькі гадоў Нарштэйн ёй скажа: «Вось так у Вас трапілі бацылы анімацыі, так Вы заразіліся!»

Сусветная анімацыя звязана з Беларуссю не толькі іменем Нарштэйна, але і Аляксандра Татарскага (аўтара легендарнай «Пластылінавай вароны»), і Аляксандра Пятрова (4 разы быў намінаваны на «Оскар» і аднойчы яго атрымаў), які прыехаў у Мінск па размеркаванні, але не атрымаў інтрэрнат. Так мы згубілі лаўрэата «Оскара».

Але шмат выдатных аніматараў у Беларусі працуе і зараз, сярод іх Ірына Кадзюкова, сапраўдны майстар, але ёй не чужы «страх перад белым аркушам», калі не ведаеш, што рабіць. Тады яна п'е гарбату, расказвае анекдоты, смяецца (як і Юрый Нарштэйн), але потым усё роўна ідзе і робіць: «Бываюць няўдачы, але гэта прыватны выпадак. Таксама як і кіно — прыватны выпадак анімацыі». Раней яна думала, што ўсё прыходзіць з вопытам, але пераканаў у адваротным Нарштэйн: «Не кажыце мне пра вопыт. Яго не існуе».

Ірына кажа, што ўсё ідзе ад любові, усе яе стужкі: і «Легенда пра лэдзі Гадзіву» (прыгожая, узвышаная гісторыя), і наіўная казка «Было лета», і многія іншыя яе працы. Яна ў кожнай гісторыі знаходзіць нейкія цуды, бачыць тое, чаго не бачаць іншыя: «У мяне ёсць свая эмацыйная скарбонка. Там могуць быць пахі, смакі, тое, ад чаго вам рабілася добра. Хай гэта адчуюць і іншыя. Вельмі хочацца дзяліцца тым, што ўражвае. Я думаю цыкламі, гэтым і адрозніваюся ад іншых рэжысёраў. Цыкл — гэта мой магічны крышталь. Усе фільмы дапаўняюць адзін аднаго».

Яна не збіралася быць рэжысёрам, яна хацела займацца толькі мультыплікацыяй. Ёй і гэтага было дастаткова — мара спраўдзілася. Яна не думала, што будзе знаёма з вялікім Нарштэйнам, што будзе ездзіць на фестывалі і прэміі ў прыгожых доўгіх сукенках. Кадзюкова кажа пра сябе: «Перад вамі шчаслівы чалавек». І сапраўды ёй верыш, асабліва калі ўбачыш хоць адну яе працу — нешчаслівы такога проста не зробіць. Самым вялікім цудам Ірына лічыць нараджэнне дзіцяці: «Як яно расце? Гэта ж неспасцігальна!..» Можа, менавіта таму яе фільмы такія: цуд для цуду?

Калі запытаць, каму Кадзюкова прысвячае казкі, для каго яна іх робіць, то яна адкажа, што гэта «ўнутранае прысвячэнне сабе-дзяўчынцы». І гэта відаць, бо лепш, чым для сябе, не зробіш ні для каго. Таму яе мультфільмы такія кранальныя, зробленыя з любоўю.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР**

■



Шапэн.

■ Выстава



Кот у акварыуме.

**Немагчымае магчыма: калі каты плаваюць, то чаму людзі не лятаюць, як птушкі?**

# Адносны кот (паводле Энштэйна)

**Ох ужо гэтае сучаснае мастацтва, чаго толькі не зробіць з людзьмі і істотамі. І так, і гэтак, і ўсё паставіць з ног на галаву, што ты потым будзеш хадзіць, напружваць мозг і думаць: «Можа, так і трэба?» Ну, каб трошкі жыццё ўзварухнуць і расквеціць. Вось каб яно падавалася такім мастацкім творам, дзе кожны няправільны альбо нелагічны рух — яшчэ адна фарба на палітры лёсу. І калі сапраўды лінію лёсу нельга змяніць, то замаляваць яе на далоні яркім чырвоным, нечаканым зялёным альбо дакладным чорным з элементамі (так і быць) звычайнага сіняга чарніла — чаму не?**



Палёт Маргарыты.



Уладзіслаў Куфко.

Расквеціць звычайнае і паставіць яго ў незвычайныя ўмовы ўзяўся мастак з Брэста Уладзіслаў Куфко. Яго можна палічыць чалавекам дзіўным (калі не сказаць больш рэзка): гэта ж трэба, загнаў ката ў акварыум. Не, не ў рэале ўсё ж, а ва ўяўленні. Таму што «Кот у акварыуме» — гэта назва яго персанальнай выставы, якая працуе ў вялікай зале Музея сучаснага выяўленчага мастацтва. Але яна з шэрагу тых, дзе адразу трэба быць гатовым да таго, каб ката знайсці і ўбачыць і ў думках упісаць яго ў акварыум, калі падасца, што аўтар гэта выявіў неяк недакладна.

Ну, недакладна. Дакладна ж ніхто не будзе катаваць ката, садзіць яго ў акварыум, а потым пісаць «з натуры». Усё не так літаральна. Але калі ўявіць, што акварыум — гэта трошкі шырэйшае, чым акварыум з рыбкамі, гэта нібыта пакой, а вадкасць — паветра (эфір), які яго запаўняе, то зразумела, што з катом нічога дрэннага не здарыцца. Ці яшчэ гэта можа быць выйсце ў нейкі паралельны свет, дзе кот спачатку дэматэрыялізуецца, каб потым матэрыялізавацца ў іншым свеце і зажыць абсалютна іншым жыццём. Можна пайсці далей, як прапануюць арганізатары выставы: «Кот у Акварыуме — гэта праграміруемая матэрыя, якая можа змяняць свае фізічныя ўласцівасці? І потым, можа быць, што гэты «Кот» зусім і не кот? А «Акварыум» быццам бы і не акварыум, а толькі ўяўленне пра яго, ілюзія?»

Вось усё і становіцца на свае месцы: і мастак ужо не такі сапсаваны чалавек, а чараўнік, які распараджаецца рэчамі, нібыта толькі ад яго залежыць іх існаванне. У рамках выставы так яно і ёсць. Ён стварыў і прапанаваў аснову для далейшага развіцця гэтых рэчаў. Натуральна, што ў выявах (карцінах) нічога не зменіцца, але можа змяніцца ў галаве людзей, якія на гэта глядзяць. Яны могуць пачаць фантазіраваць. Яны ўключаць сваё трэцяе вока — і ўбачаць паралельны свет, зразумеюць, што ўсё наогул вельмі адносна. Тут вам адначасова згадка і пра Альберта Энштэйна, яго «джазавы партрэт», як кірунак, у якім трэба мысліць (вось толькі паспрабуйце там разгледзець самога Энштэйна!). Тут вам і парушэнне законаў гравітацыі — з магчымасцю палётаў для Маргарыты (колькі спакусы ў гэтым учынку). І Русалкі на ветках сядзяць (і не толькі на ветках, таму асабліва небяспечныя). Карацей, усё, што мы лічылі трызненнямі асабліва таленавітых людзей, раптам можа акрэсліцца і нават зацягнуць у нейкія іншыя сусветы. Усё залежыць ад таго, што ўзяць за кропку апоры. І ў чым пабачыць паралельнасць існавання, а мастак Куфко нібыта падказвае, шукае паралелі і падабенствы паміж рэчамі і з'явамі абсалютна процілеглымі. У яго творах жывуць парадоксы, і ён іх не баіцца. Ён іх уключае ў свае сэнсавыя загадкі, выяўленыя і расквечаныя фарбамі.

Дзіўна для мастака, які жыве ў сваім родным Брэсце. Пры гэтым выстаўляўся за межамі Беларусі — у Галандыі, Германіі, Польшчы. У 1987 годзе Уладзіслаў Куфко атрымаў сярэбраны медаль на выставе «Маладыя мастакі» ў Маскве. Быў адзначаны як «Чалавек года ў галіне выяўленчага мастацтва» Беларускім фондам культуры ў 2000 годзе. А ў юбілейным, 2005, годзе ўзнагароджаны медалём Беларускага саюза мастакоў. Натуральна, лепшая ўзнагарода для мастака — цікавасць да яго прац. А яна ёсць: з боку музеяў і прыватных калекцыянераў. Хочацца, відаць, у паралельную прастору.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■

■ Імпрэзы

# СВАБОДА ДЛЯ ТВОРЦАЎ

## Летам па суботах культура выходзіць на плошчу

**Месца сустрэч — плошча Свабоды: апоўдні тут збіраюцца творчыя асобы, каб паказваць тое, што ўмеюць, кантактаваць, размаўляць, забаўляць і далучаць да інтэрактыву тых, хто ў сталіцы жыве альбо прыехаў у Мінск на вакацыі ці як турыст. Гэта расцягнутыя фактычна на ўвесь дзень «тусоўкі» для цікаўных і неабыякавых, каму надакучыла сядзець дома. І навошта, калі можна ў адным месцы паглядзець розныя тэатралізаваныя паказы, рыцарскія баі, пабачыць «жывыя скульптуры», паслухаць «жывых» музыкаў?**

Кожны раз ёсць магчымасць пабачыць нешта новае. Нават тыя ж тэатралізаваныя паказы прадуманы па розных тэмах ад самой беларускай старажытнасці і шляху «З варагаў у грэкі», Полацкага княства да гісторыі Магдэбургскага права (натуральна для падзей ля Ратушы), расповед пра князя Вітаўта і іншых уладароў Вялікага Княства Літоўскага. І іншыя перыяды таксама знойдуць адлюстраванне: XIX стагоддзе дапаможа раскрыць губернскі баль. XX — нагадае пра самыя драматычныя падзеі, звязаныя з дзвюма войнамі, якія прайшліся па тэрыторыі нашай краіны. Глядзець і разумець — адна справа. Але чым добры такі адпачынак, дык магчымасцю нешта асвоіць самому. Можна паспрабаваць заняцца кавальскай справай. Ці навучыцца страляць з лука. Ці тыя ж танцы сярэднявечныя асвоіць — чаму не? Ды і сучасныя патанчыць разам з сябрамі. Ці майстры пластычных перформансаў могуць здзівіць мудрагелістымі думкамі, якія перадаюцца праз рухі. Сваю справу будуць рабіць і вулічныя акцёры, для якіх гэты час — самы чаканы: з эксперыментальных тэатраў «Te=(art)», «EYE», тэатра ўзаемадзеяння «Мусташ», вулічных тэатраў «Вір», «Тэатр з гарышча» і іншых. І музыкі могуць сабраць вакол сябе публіку. Тым больш, што літаральна на вуліцы можна часам пачуць тых, чые песні потым будуць гучаць на радыё ці ў тэлеэфіры. У фестывалі вулічнай музыкі сёлета заяўлены такія ўдзельнікі, як гурты «Юлані», «Street Band», «Танга Чашырскага ката», інструментальны ансамбль «ARS LONGA» і іншыя.

Няпраўда, што летам культурнае жыццё з горада сыходзіць. Сталічная плошча Свабоды — месца сустрэч для тых, хто замест адпачынку ля вады ці на градках аддае перавагу жывым зносінам і актыўнаму далучэнню да творчасці. Часам — спантаннай, нястрыманай, вольнай. Тое, што стала сімвалам еўрапейскіх гарадоў, — напоўненыя крэатывам і жывой энергіяй вуліцы — Мінск асвойвае пакрысе. Але не адмаўляецца ад самой ідэі ажывіць гарадскую прастору ў летні час.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■

■ Напярэдадні прэм'еры



# Не спаць!

## Рэжысёр Іскандэр Сакаеў пра «Сон у летнюю ноч» і тэатральны Мінск

**Сярэдзіна ліпеня. Час, калі тэатральнае жыццё заціхае. Тэатры ў асноўным упадаюць у летнюю спячку, а спектаклі прыходзіцца літаральна «лавіць», калі яны яшчэ недзе ёсць. Нібыта глядач летам не такі актыўны, гэтым абумоўлены звычайна летнія «тэатральныя канікулы». І вось у такі час Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр ладзіць прэм'еру — на закрыццё свайго сезона. Прэм'еру, якую аматары тэатра ніякім чынам не абыдуць увагай з трох прычын. Па-першае, праз тое, што для лета гэта выключны выпадак. Па-другое, шэкспіраўскі «Сон у летнюю ноч» найбольш адпавядае настрою і думкам, уласцівым для лета. І трэцяе: аўтар пастаноўкі — запрошаны рэжысёр з Расіі Іскандэр Сакаеў, для якога гэта трэцяя праца ў беларускім маладзёжным тэатры (у афішы ёсць такія яго спектаклі, як «Казіны востраў» і «Чайка»). Першыя дзве выклікалі вельмі гарачыя спрэчкі, а тэатралам запомніліся своеасаблівай трактоўкай і вырашэннем. Некаторыя ўжо напружыліся: што ж атрымаецца з Шэкспіра? Пра тое, што атрымаецца ў выніку, мы абавязкова раскажам сваім чытачам і кожны з іх зможа маральна падрыхтавацца да прагляду гэтага спектаклю ўжо ў новым сезоне. Але сёння хацелася б прыслухацца да размоў Іскандэра Сакаева пра тое, што ёсць тэатральны працэс у Беларусі і якім чынам у яго можа ўпісацца спектакль «Сон у летнюю ноч» паводле Шэкспіра.**

## П'ЕСА

— З тых пастановак «Сну ў летнюю ноч», што я рабіў у Баку і Іжэўску, гэтая найбольш адпавядае таму, што я хацеў бы бачыць. Гэта найбольш «мой» спектакль, па тым, як ён будуецца, па тым, якія сэнсы счытваюцца акцёрамі. Але ўсё роўна будзе асобны спектакль: бакінскі тэмперамент з мінскім ніяк параўнаць нельга, гэта розныя стыхіі. Адна п'еса, але атрымаліся тры розныя спектаклі, таму што гэта тры этнасы, тры розныя культуры, хоць паўсюдна я ставіў на рускай мове. Але нават руская мова ў розных мясцінах розная. І гэта тры розныя прасторы. Да Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра ў мяне асаблівае стаўленне. На гэтай пляцоўцы і ў гэтай прасторы — прыярытэт для акцёраў. Сцэнаграфія выконвае службовую функцыю, з'яўляецца іграваым фонам для іх. У працэсе працы над сцэнічнай рэдакцыяй я апусціў нюансы, якія ў кантэксце сучаснасці ўжо не зусім зразумелыя — упрыгажэнні, жарты, якія ў часы Шэкспіра былі актуальныя. Лічу, што добры тэкст можна ставіць і ў пяты, і ў шосты раз, бо кожны раз у ім нешта адкрываеш. Шэкспіраўскі схіляе да пошукаў. «Сон у летнюю ноч» — гэта п'еса, якая не мае прывязкі да канкрэтных гістарычных падзей, да канкрэтнай эпохі. Афіны там вельмі ўмоўныя, найбольш дакладная частка ва ўсёй гэтай гісторыі — тое, што звязана з духамі, з лесам, з магамі, паганскімі абрадамі.

У нас жанр пазначаны як «небяспечная камедыя». Калі ставяць гэтую п'есу, то апускаюць як правіла самае галоўнае: п'еса пачынаецца з вайны, толькі што скончылася вайна паміж афінянамі і амазонкамі. І потым будзе наступная вайна... Міфалагічная калізія не вельмі прадугледжвае весялосць. «Небяспечная камедыя» — непрадказальная. Сапраўды, п'еса пра каханне, але тут вельмі шмат дзіўнага, з даволі сумнай высновай, што ўсё каханне — гэта морак і самападман. Атрымліваецца: адносіны галоўных герояў абумоўлены ўздзеяннем кветкі — наркотыку ці афрадэзіяку. А потым з іх здымаюць уздзеянне кветкі, але адзін застаецца ў гэтым стане. Гісторыя такая, што яе складана прайграць, супаставіць са сваім чалавечым досведам. Вось каму, напрыклад, удавалася ператварыцца ў асла, а потым наадварот?.. Адкрытая тэатральнасць, іграваыя моманты, дыктуюць адпаведны спосаб існавання і падыход да самой п'есы: немагчыма сур'ёзна пражываць гэтыя калізіі. Ёсць ілюзія, што ўсё сур'ёзна і па-сапраўднаму, але гэта гульня... З іншага боку, тэкст Шэкспіра дысцыплінуе акцёраў: трэба трымаць радок, трэба быць увесь час вельмі сабраным і пры гэтым нясумным. Александрыйскі верш схіляе да таго, каб ужо да трэцяй старонкі маналогу глядач пачынаў «распаўзацца» і драмаць. Таму мы яшчэ шукалі дзейсную дамінанту, якая магла б абуджаць і стаць дабаўкай да асноўнай стравы.

## ГЛЯДАЧ

— У мяне была задача зрабіць нясумна — гэта ўсё-такі маладзёжны тэатр. Мінская шырокая публіка (не маю на ўвазе тых, хто сочыць за тэатральнымі фестывалямі) ужо вельмі не спешчаная разнастайнасцю. Беларускага гледача прывучылі да аднатыпнага тэатра, і ён не гатовы бачыць нешта дзіўнае. Задача мая, як рэжысёра, — прыцягнуць у гэты тэатр такога гледача, які жадае дзіўнага, хто хоча нечага такога, чаго не ўбачыць ні ў якім іншым месцы. Я хадзіў па мінскіх тэатрах. Вельмі люблю беларускі тэатр, у свой час быў актыўным гледачом тэатра імя Янкі Купалы. Але апошнім часам ёсць адчуванне, што ты ва ўсіх тэатрах глядзіш адзін спектакль. Нудны, бытавы. Нават не столькі справа ў дэкарацыях, а ўвогуле ў прадказальнасці. Хочацца рабіць нешта непрадказальнае. Натуральна, калі чалавека прывучылі есці рыс на першае, на другое, на трэцяе і на дэсерт, а тут раптам яму прапануюць фуагра, ён насцярожыцца. Ён не ведае смаку дзіўнай экзатычнай стравы і спачатку, верагодна, будзе пляваца. Тут трэба даць зразумець, што гэта, каб рассмакаваць. Узрушыць чалавека. А то і без таго ўсё добра ў беларускіх тэатрах, таму павінен быць спектакль, дзе ўсё не так прыгожа-цудоўна, дзе ўсё скандальна, дзе глядач патрабуе грошы за квіткі. Павінен быць такі спектакль, як адначасова могуць быць і тыя, дзе ўсе цудоўна засынаюць, у свой час прачынаюцца, каб пацляскаць і ўручыць абавязковыя маргарыткі. Няхай гэта будзе мой спектакль. Затое тыя, хто застаецца на ім да канца, адчуваюць сябе пераможцамі: мы выцерпелі!.. Я чытаў водгукі на «Чайку», і мяне парадавалі, напрыклад, нават крайне негатыўныя. Што мне падабаецца ў Беларусі: тут людзі пішуць адкрыта, не баяцца выказаць сваё стаўленне. Але адчуваецца, што глядач прывык да кашы. Я лічу, што мае спектаклі, хутчэй, як сырое мяса. Трэба кашу разбаўляць, можа, таму мяне і запрашаюць, бо які сэнс ствараць спектаклі, якіх і так шмат у рэспубліцы? Тым больш, што галоўны ўтрымальнік тэатра — людзі, якія купляюць квіткі. Трэба зрабіць так, каб яны, прыйшоўшы ў тэатр, захацелі яшчэ раз прыйсці, можа, нягледзячы на тое, што ім не ўсё спадабалася. Каб ім захацелася паспрачацца. Добрым крокам з'яўляецца прамы кантакт з гледачом. Размовы, абмеркаванні, круглыя сталы. Каб быў момант вербальнага ўзаемадзеяння. Важна выхоўваць такога гледача, які жадае прыйсці менавіта сюды і ўбачыць менавіта гэта.

## ТЭАТР

— Я вельмі люблю Мінск і вельмі люблю маладзёжны тэатр менавіта таму, што тут можна ўсё. Я такую «Чайку» не мог бы сабе дазволіць ні ў якім Ніжнім Ноўгарадзе (гэта не літаральна, а, хутчэй, прыклад тэатральнага традыцыяналізму). А тут я магу дазволіць сабе свабоду, лёгкасць ва ўзаемадзеянні з акцёрамі і дыялогу з гледачом. Я такое не ў кожным расійскім горадзе і тэатры магу сабе дазволіць. Больш за тое, у Санкт-Пецярбургу шмат якія вольнасці ўспрымаюцца з недаверам, вось Масква наадварот вельмі лаяльная. А Мінск у гэтых адносінах, мне здаецца, сталічны горад. Амаль еўрапейскі. Іншая справа, што яму трэба паказваць рознае, паказаць такое, што, можа быць, цяпер і не спадабаецца. Мінск, наогул Беларусь, знаходзіцца пакуль у вельмі камфортным становішчы паводле таго, як тэатр узаемадзейнічае з гледачом у параўнанні з тым, што адбываецца ў Расіі. Таму што там за гледача трэба ўжо змагацца, рабіць нейкія высілкі для таго, каб ён прыйшоў у тэатр. Там вымушаны выжываць. Але мне здаецца, што маладзёжны тэатр вызначае кірунак таго, што хутка і тут трэба будзе не рабіць гледачу «прыгожа», а фарміраваць яго густы і працаваць так, каб ён хацеў прыйсці сюды, таму што тут ён атрымае нешта такое, чаго яму ні дасць ні кіно, ні казіно, ні яшчэ нешта. Гэты тэатр спрыяе стварэнню асяродка. Але сустрэчы з гледачамі павінны быць сістэмнымі. Павінна быць праграма. У пачатку сезона, калі ўсе са свежымі сіламі, можна спрачацца, адстойваць свой пункт гледжання. Гэта добрая справа, яна дае чалавеку магчымасць быць уключаным у працэс, адчуваць сябе саўдзельнікам, што яго меркаванне таксама важна. У мяне ўжо склалася свая сістэма ўзаемаадносінаў з гэтым тэатрам. Тут вялікая колькасць цікавых акцёраў, якія неабыякавыя да таго, што яны робяць. Дзіма Багаслаўскі, які не цудоўны артыст і драматург. Я ведаю яго п'есы, бачыў па іх спектаклі. Але гэта не маё. Мне вельмі падабаецца яго «Ціхі шэпт сыходзячых крокаў», гэта вельмі добрая драматургія. Але выключэнне з правілаў, з шэрагу той сучаснай драматургіі на рускай мове, якая сёння вызначае асноўныя кірункі ў тэатры. На жаль, сучасная рускамоўная драматургія вельмі прайграе літаратуры, з якой я люблю працаваць. Літаратура ўплывае на тое, што адчуваеш сябе сааўтарам, можаш даць жыццё таму, што яшчэ не было рэалізавана ў тэатры.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» — ПЛЯЦОЎКА МІЖНАРОДНАГА КУЛЬТУРНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ


Лілія АНАНІЧ


Ірына ДРЫГА


Генадзь ДАВЫДЗЬКА


Алесь КАРЛЮКЕВІЧ


Уладзіслаў БАГІНСКІ


Валерый АНІСЕНКА


Уладзімір НАВУМОВІЧ


Ірына ДАРАФЕЕВА


Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА


Яўген САФРОНАЎ


Таццяна МАРТЫНАВА

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

**Лілія АНАНІЧ:**

— «Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцей. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў» — гэтую глыбокую тэму мы задумвалі як акцэнт усяго фестывалю. Бо, калі на старонках газет, у эфіры радыё і тэлебачання ўлягуцца першыя ўражанні ад прыгожых песень і прэм'ер, ад новых творчых знаёмстваў, у журналістаў пачнецца асэнсаванне таго, што з'явілася новага на такім міжнародным праекце, які сёлета сабраў больш за сорак краін.

На адкрыцці наш Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў фестывалю, сказаў пра тое, што Беларусь па праве стала пляцоўкай мірных ініцыятыў, праваднікам ідэй міру і супрацоўніцтва. І вельмі хацелася б, каб у фармаце такіх вось творчых сустрэч мы збіраліся штогод і каб у журналістаў была магчымасць прыязджаць у нашу краіну тады, калі ў гэтым ёсць творчая неабходнасць. А мы, Міністэрства інфармацыі, гатовы дапамагаць у арганізацыі такіх творчых дэбатаў і не толькі па тэме культуры, але і па ўсіх тэмах, якія сёння цікавяць СМІ. Мы шмат робім для таго, каб слова «мір» было не пустым гукам. На пачатку лютага, калі ў Мінску вялікія палітыкі фактычна вырашалі лёс свету, побач з Палацам Незалежнасці праходзіла міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. На ёй прэзентаваўся новы праект — форум літаратараў «Пісьменнік і час», і там творчыя людзі таксама гаварылі аб міры, аб неабходнасці, аб абавязку яго захаваць. У гэтым ёсць вялікі сэнс, таму што сёння слова пісьменніка, журналіста як ніколі павінна кансалідаваць чытача, гледача для пошуку глыбокіх думак і слоў, якія пачуюць народы і краіны. Таму і на форумах, падобных да «Славянскага базару», галоўнымі гасцямі нароўні з дзеячамі мастацтва хочацца бачыць менавіта журналістаў, бо яны нясуць чытачу тое, што бачаць на свае вочы. Калі мы дадзім ім глебу для разважанняў і самае галоўнае — магчымасць сказаць нам, што яшчэ ім хацелася б бачыць на палях гэтага фестывалю, — СМІ эфектыўна выканаюць сваю місію служэння міру і ўзаемапаразуменню...

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ:**

— Каб выканаць гэтую місію, трэба адказаць на надзвычай важнае пытанне: што сёння з'яўляецца галоўнай зброяй у сцвярджэнні сусветных духоўных і культурных каштоўнасцей? Ці можна назваць такой зброяй славянскую культуру?

**Генадзь ДАВЫДЗЬКА:**

— Справа ў тым, што тут трэба разумець месца песеннай і духоўнай культуры. Калі вы маеце на ўвазе культуру аўтэнтычную, то, безумоўна, гэтага мала. Але ж у Віцебску падчас фестывалю праходзіць не толькі конкурс эстраднай песні — Віцебск стаў цэнтрам многіх мастацтваў, што дапамагае разумець сваё месца на агульнай прасторы культурнай супольнасці.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ:**

— І поле «Славянскага базару», і тэма нашай размовы значна шырэйшыя, чым славянскае адзінства, славянская культура, асабліва ў разуменні нейкіх аўтэнтычных момантаў і асноў. Сёння свет цікавы, калі ён спакойны, калі не адбываецца ніякіх войнаў. І тое, што Мінск, Беларусь — міратворчая пляцоўка, можна назваць нашым беларускім, славянскім праектам. Той факт, што «Славянскі базар» сёння прымае гасцей з розных краін і выканаўцаў самых розных народаў, мае большае значэнне, чым размова пра аўтэнтычнасць славянскіх культур. Культура — самы галоўны падмурак духоўнасці і маральнасці ў развіцці чалавека. Калі яна (няважна, у якім складніку — эстрада, літаратура, аўтэнтычная культура, тэатр), што ствараецца ў імя прыярытэтаў духоўнага і маральнага развіцця, не будзе ўдзельнікам сацыяльных працэсаў, калі яна не будзе асновай руху наперад, то тады і грамадства прыйдзе да заняпаду. Можа, у гэтым ключы нам варта разумець і нашу асаблівасць, прыналежнасць да славянскага свету і да яго духоўнага стварэння.

**Генадзь ДАВЫДЗЬКА:**

— Я згодны з вашымі разважаннямі. Дадам, на фоне ўсіх глабальных палітычных падзей, не кожная дзяржава можа дазволіць сабе фестываль такога ўзроўню, як «Славянскі базар». А тая рэкордная колькасць краін — удзельніц сёлетняга форуму сведчыць пра тое, што ў такія няпростыя часы, у непакоі за будучыню, за бяспеку людзям хочацца зблізіцца, паслухаць, як б'ецца сэрца сябра, супакоіцца. Таму ў Беларусі сёння імідж мяккай, добрай маці, якая запрашае: прыязджайце, пагаворым, паспяваем песні. Больш за тое, калі 24 гады таму фестываль наш выглядаў так, нібы ў маленькі горад заехалі вялікія грузавікі, нагазавалі, каля чыстага возера пакідалі смецце і з'ехалі, а Віцебск доўга ачомваўся, то зараз горад вырас — і эканамічна, і архітэктурна — і цяпер ужо мы бачым не маленькага чалавечка ў вялікім паліто, а маем брыльянт у годнай аправе. І калі раней многія артысты рабілі як бы ласку, прыязджаючы сюды, то сёння пабываць на фестывалі для іх гонар. Не атрымаўшы запрашэнне на «Славянскі базар», артыст думае: «Можа, я не ў рэйтынгу?»

**Ірына ДРЫГА:**

— «Славянскі базар» — мерапрыемства не толькі і не столькі забаўляльнае, колькі грамадска-культурнае, дзе павінны адбывацца сустрэчы, канферэнцыі, кантакты фармальныя і нефармальныя прадстаўнікоў культуры розных краін, якія спрыялі б рэалізацыі фестывалю праз мастацтва, культуру, умацаванню міру і ўзаемаразумення. Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўнай маральнасці вельмі падыходзіць «Славянскаму базару», дзе прадстаўлены розныя віды мастацтваў і адсутнічае такое паняцце, як «фармат», яно тут замяняецца іншымі — «майстэрства», «прафесіяналізм». Кожны мае магчымасць праявіць сябе на канцэртах, тэатральных праграмах, на кірмашах. Галоўнае — каб людзі былі таленавітыя і іх творчасць насіла духоўны, гуманістычны характар. Усё негатыўнае і дэструктыўнае на «Славянскім базары» не прыжываецца. Яшчэ хацелася б, каб СМІ больш звярталі ўвагу на тое, што наш фестываль скіраваны на паказ культурнай разнастайнасці і культурнай самабытнасці розных народаў. Тое, што славянская культура ўсёабдымная і аб'ядноўвае, злучае розныя традыцыі, таксама падкрэсліваецца на фестывалі. Колькасць краін-удзельніц расце, значыць, змест фестывалю выклікае цікавасць у свеце. Таму хацелася б папрасіць СМІ не абмяжоўвацца рэпартажамі і здымкамі з месцаў падзей, інтэрв'ю з зоркамі, але і звяртаць увагу на глыбінную сутнасць, на духоўны складнік «Славянскага базару» як фестывалю, грамадска-культурнага мерапрыемства, якое аб'ядноўвае не толькі славянскія, але і ўсе народы.

**Яўген САФРОНАЎ:**

— Вельмі добра сказала Ірына Уладзіміраўна пра ролю, якую адыгрывае «Славянскі базар», і я гэтую тэму нават трохі пашырыў бы. Такі фестываль — асаблівая з'ява на ўсёй постсавецкай прасторы. Тут трэба разумець адну важную рэч — гэта мерапрыемства пад эгідай дзяржавы. Значыць, дзяржава лічыць неабходным ім займацца. Мы разумеем, што стабільнае развіццё любой краіны магчыма толькі пры наяўнасці трох эфектыўна працуючых інстытутаў — СМІ, масавай адукацыі і масавага, у першую чаргу відовішчнага, мастацтва. Правядзенне «Славянскага базару» на такім высокім узроўні — гэта сведчанне таго, як у Беларусі гэтыя інстытуты працуюць і ўзаемадзейнічаюць. Неэфектыўнасць любога з іх нясе пагрозу для дзяржавы не менш сур'ёзную, чым неэфектыўнасць, напрыклад, арміі або міліцыі. Значыць, імі трэба кіраваць. А як? Усё часта зводзіцца да аднаго выбару: ісці за сучаснасцю ці прытуліцца да вытокаў. Але ўсё не так проста. Масмедыя, якія цяпер называюць чацвёртай уладай, рэзка павысілі сваю значнасць. Трэба разумець, што гэта наймагутнейшая зброя. Уплыў новых медыя павялічваецца з кожным днём — гэта заканамерны працэс, але нават развітыя краіны да гэтага не гатовы. Усе хацелі б, каб улада масмедыя выкарыстоўвалася з мэтамі гуманізму і прагрэсу, але мы ведаем, што гэта не так. Зрэшты, справа ў людзях, а не ў словах. Менавіта таму мы абавязаны такое сур'ёзнае мерапрыемства, як «Славянскі базар», зрабіць і данесці да максімальнай колькасці людзей. Калі тое, што адбываецца сёння на фестывалі, добра падаць, то гэта будзе цалкам рэйтынгавы прадукт, які працуе на ідэі міру і паразумення.

**Таццяна МАРТЫНАВА (журналіст):**

— Вы сказалі «добра падаць»... Мы гаворым пра ўзаемаразуменне, а з боку расійскіх тэлевізійнікаў яно цалкам адсутнічае. Вазьміце фестывальную праграму гэтага года, там каля ста мерапрыемстваў, і параўнайце з тым, што будзе паказана на расійскіх тэлеканалах. Сёння яны перадаюць усё са спазненнем на дзень. І канцэрт працягласцю ў тры гадзіны ў іх доўжыцца паўтары гадзіны, пры гэтым хвілін дваццаць — рэклама. Чаму такое стаўленне? Значыць, можа, трэба нават і на ўзроўні Саюзнай дзяржавы гэтае пытанне паставіць і вырашыць. Бо ўсе расіяне, якія ні разу не бывалі на «Славянскім базары», упэўнены, быццам тут толькі танцуюць і спяваюць. Але ж ёсць і вялікая тэатральная праграма, выставы выяўленчага мастацтва, культурныя дыялогі... А ў людзей ўражанне, быццам высаджваецца дэсант расійскіх артыстаў, іх паказваюць па расійскім тэлебачанні. І на гэтым усё заканчваецца.

**Лілія АНАНІЧ:**

— Я не магу не адгукнуцца на гэтую заўвагу, таму што мы такім чынам збядняем не толькі расійскага гледача, але і беларускага, бо ў нас тэлебачанне з Расіі ідзе ў кожным доме і, вядома, мы глядзім, як асвятляюцца тыя ці іншыя падзеі, з'явы. Думаю, мы таксама не бачым тых вялікіх праектаў, іх глыбіні, якія праходзяць у Расійскай Федэрацыі. Сёння нашы краіны як ніколі, напэўна, блізкія, і СМІ павінны адчуваць гэты камертон грамадскіх настрояў, грамадскіх меркаванняў.

**Уладзіслаў БАГІНСКІ:**

— Што тычыцца нашай краіны, то апошнія тры гады ўкраінскія гледачы наогул не бачаць, што адбываецца на «Славянскім базары», хаця ў свой час ён даваў высокія рэйтынгі і назіраўся інтарэс аўдыторыі. Мы не паказваем нічога. І сёння я тут з мэтай знайсці ўпушчанае, вярнуць яго, зрабіць усё магчымае, каб людзі ва Украіне былі далучаны да гэтай падзеі, якая, як мы тут гаворым, значная не толькі ў культурным плане.

**Валерый АНІСЕНКА:**

— Думаю, адзін з цікавых складнікаў, якімі валодае фестываль, — тэатральныя старонкі — асвятляецца не найлепшым чынам. Напрыклад, летась тэатр Якуба Коласа паказаў начны спектакль «Макбет» на пленэры. Той, хто быў і бачыў яго, згадзіліся, што гэта была адна з найбольш яркіх падзей. Увогуле, ідэя з тэатрам на двары — яна светлая і незацягеная... Думаю, можна было б у фестывальныя дні «прапісаць» тэатр на пленэры і далучыць сюды фестывальную афішу. Гэта было б цікава.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ:**

— Усе мы аднадушныя ў тым, што хочам больш эфіру, больш газетных палос і ўвагі. А гэта яшчэ залежыць і ад шматлікіх складнікаў, ад садружнасці, партнёрства, якое выяўляецца ў падрыхтоўчым працэсе. Нам хацелася б, каб было як раней, калі мы былі ўсе разам, жылі ў адной краіне, калі нават лішні раз не трэба было казаць пра славянскае адзінства. А сёння, калі ў нашых незалежных краінах розныя ўклады, адносіны да соцыуму, гэта, напэўна, уплывае на стасункі і ў культуры. Таму так і адбываецца ў асвятленні таго ж фестывалю: камусьці не заплацілі, іншыя атрымалі мала, хтосьці палічыў, што гэта не ўкладваецца ў яго прыярытэты. Але ж ёсць дзеячы культуры, напрыклад пісьменнікі, якія могуць дапамагчы нам змяніць нешта, паўплываць на грамадства, аднавіць тыя сувязі, прыстасаваўшы іх да сучаснасці...

**Уладзімір НАВУМОВІЧ:**

— Кажучы вобразна, раней маці, калыхаючы малое, спявала песню, а яшчэ адначасова прала кудзелю. Нітка навівалася на верацяно, а матчына песня навівалася на сэрца сына ці дачкі. З таго часу кожны з нас размотвае нітку матчынай песні са свайго сэрца, баючыся яе парваць. Але пісьменнік сёння павінен не толькі апекаваць захаванне спадчыны, але і бачыць тое, што адбываецца ў краіне, у сучасным грамадстве, бачыць і даносіць гэта да людзей. Можна сказаць, што наша літаратура грунтуецца сёння на духоўнай аснове, яна існуе як скарбніца і крыніца маральнага імператыву...

**Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА:**

— Адштурхоўваючыся ад тэмы нашага круглага стала, хачу сказаць, што паэзія ёсць душа мастацтва. І менавіта яна тая сіла, якая дапамагае фарміраваць развітога чалавека. Нам сёння трэба пісаць творы, здольныя выхоўваць асобу, якая будзе моцна стаяць на нагах і будзе перакананая, што не ўсё прадаецца і купляецца, якая ўмее адчуваць і суперажываць. Бо можна глядзець і слухаць, але не бачыць і не чуць. Бо справа не толькі ў тым, колькі і што нам паказваюць, а як мы ўмеем гэта ўспрымаць.

**Ірына ДАРАФЕЕВА:**

— І ўсё ж вельмі важна, каб аб нашым фестывалі чулі, ведалі як мага больш, каб ён працягваў жыць. У гэтым могуць дапамагчы і пісьменнікі, выступаючы ў СМІ. А СМІ, журналісты павінны не толькі асвятляць, але і папулярызаваць гэтае мерапрыемства. Хацелася б, каб акцэнт рабіўся на асобах, таму што на таленты багатая наша беларуская зямля. Павінны быць прадстаўлены і паэты, і кампазітары, і артысты. На фестывалі, дзе ўсё мастацтва паказана праз яркіх асоб, было б выдатна, калі б вы часцей звярталіся да гэтых імён, а мы маглі б пра іх больш даведацца, пачуць іх думкі, погляды на жыццё, на падзеі, што адбываюцца ў свеце. У фарміраванні грамадскай думкі гэта таксама важна.

**Лілія АНАНІЧ:**

— У інфармацыйнай прасторы сёння адбываюцца працэсы, якія вызначаюць парадак дня жыцця грамадства ўвогуле. І сфера культуры самая спрыяльная пляцоўка для таго, каб гэтыя працэсы зближалі краіны, людзей і народы. На «Славянскі базар» прыязджае маладое пакаленне артыстаў, якія заўтра будуць мэтрамі. І тое, што яны набываць тут, для кагосьці стане маральным прынцыпам, стрыжнем творчай асобы і чалавека... Сёння неабходна шукаць творчыя, культурныя масты паміж краінамі, і роля СМІ, журналістаў тут вельмі важная. Думаю, мы з Міністэрствам культуры будзем садзейнічаць такім творчым дэсантам у Беларусь, не толькі на буйныя мерапрыемствы кшталту «Славянскага базару», але і дзеля знаёмства з нашай гістарычнай спадчынай, з самымі рознымі нашымі праектамі, якія сёння рэалізуюцца ў сферы культуры. Каб нашы калегі данеслі сваім аўдыторыям ідэі яднання і міру — тое галоўнае, што ім захочацца пакінуць і ў нататніку «Славянскага базару».

**Запісала Алена ДРАПКО.**

*drapko@zviazda.by*




Фота БЕЛТА.

■ Глыбінка

# «Сад натхненняў» у Барбарычах

## Сяргей і Наталля Арлоўскія ствараюць інтэрактыўны біёлага-экалагічны парк


Наталля і Сяргей Арлоўскія каля свайго саманнага дома.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**Гэты праект цяпер ажыццяўляецца ў вёсцы Барбарычы Гродзенскага раёна дзякуючы энтузіязму ўжо былых гараджан Сяргея і Наталлі Арлоўскіх пры падтрымцы праекта USAID/ПРААН «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё». На калісьці неперспектыўных калгасных землях створаны... падземны сад, атрымалі прапіску розныя дрэвы, пладова-ягадныя і лекавыя расліны, а таксама з'явяцца музей варэння і іншыя «фішкі». Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» даведаўся, пабываўшы ў гасцях у «Радавым маёнтку Арлоўскіх» — так называецца фермерская гаспадарка.**

### ДОМ — З ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

Наталля і Сяргей пазнаёміліся ў Гродне на трэніроўцы па адным з відаў усходніх адзінаборстваў, і, як аказалася, іх паяднала не толькі гэтае захапленне. Доўгі час, стварыўшы сям'ю, разам з дзецьмі Настассяй і Аляксеем былі гараджанамі. У Барбарычах — другі год, ужо тут нарадзілася малодшая дачка Паліна.

— Даўно хацелася жыць на сваёй зямлі. Шукалі такое месца і знайшлі, — кажа Наталля.

Зараз Барбарычы актыўна забудоўваюцца, але такога дома, як у Арлоўскіх, няма ні ў кога. Сяргей — прыхільнік экалагічнага будаўніцтва з выкарыстаннем прыродных матэрыялаў і папулярызацыю гэтага пакуль не надта распаўсюджанага ў нашай краіне напрамку распачаў з сябе. Дом у «Радавым маёнтку Арлоўскіх» практычна цалкам пабудаваны з экалагічных матэрыялаў: каркас — драўляны, а сценавы напаўняльнік — саманнага тыпу (сумесь гліны з саломай).

— Такія будынкі могуць стаяць даўжэй за цэглавыя. Прычым, цяпер нават узімку не холадна (не выпадкова ж саманныя дамы будуюцца нават на поўначы), а калі завяршым уцяпленне даху, то будзе яшчэ лепш. На такі вялікі дом тады, думаю, хопіць на зіму адной машыны дроў, — разлічвае Сяргей.

На саманныя дамы не варта глядзець як на нейкую экзотыку. У шэрагу еўрапейскіх краін такое будаўніцтва падтрымліваецца спецыяльнымі дзяржаўнымі праграмамі. Ды і ў нас яшчэ захаваліся гаспадарчыя памяшканні (кароўнікі, ангары), што будаваліся з гэтых прыродных матэрыялаў. Адпаведным вопытам Сяргея яшчэ ў дзяцінстве зацікавіла яго бабуля, якая жыла ва Украіне. Там было распаўсюджана: забудоўшчыкі рыхтуюць блокі з гліны і саломы, а потым з дапамогай аднавяскоўцаў, талакой літаральна за некалькі дзён узводзяць дом. Потым пакрываюць яго дахам, хтосьці складвае саманную печ...

Арлоўскім будаваць дом дапамагалі сябры, а ў асноўным усё зрабілі самі. Такім чынам аптымальна скарысталіся крэдытнымі сродкамі.

— Калі будаваць саманны дом самому, то гэта значна танней, чым традыцыйнае блокавае будаўніцтва, — зазначае Сяргей.

Гліну, дарэчы, ён здабываў на сваім участку, пасля чаго тут з'явіўся невялікі ставок, які падсілкоўваецца шматлікімі крыніцамі. У яго можна акунуцца, прыняўшы гразевыя ванны. Бо гліна (рознай афарбоўкі — блакітная, зялёная, фіялетавая, рудая...) з'яўляецца не толькі экалагічным матэрыялам для будаўніцтва, але і мае касметычныя, лекавыя якасці, у прыватнасці пры скурных і касцявых захворваннях.

### У ГАСЦЯХ У ВІНІ ПУХА

Дзякуючы фінансавай падтрымцы праекта «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё» ў маёнтку Арлоўскіх ужо цяпер ёсць некалькі «фішак», каб зацікавіць турыстаў, і шмат іншых задум. Адзін з незвычайных аб'ектаў — падземны сад. Гэтую ідэю маскоўскія дызайнеры прадэманстравалі на конкурсе ландшафтных праектаў у Англіі. Робіцца паглыбленне ў зямлі, там — розныя кампазіцыі з раслін. І калі глядзіш зверху, то дзякуючы люстэркам ствараецца ілюзія прасторы без межаў, саду, які не заканчваецца.

Ля ўваходу ў экалагічны парк пабудалі альтанку, што служыць не толькі для адпачынку гасцей. Тут Сяргей будзе праводзіць семінары і майстар-класы па экалагічным будаўніцтве, дзяліцца вопытам з тымі, каму гэта цікава. Прычым зацікавіцца можна не толькі саманным домам, але і нейкімі малымі архітэктурнымі формамі з гэтага матэрыялу. Напрыклад, зрабіць на дачы лаўку. Альбо саманную печ ці нават лазню.

Непадалёк — невялікая пабудова (зноў жа — з гліны і саломы), дзе будзе музей варэння пад назвай «У гасцях у Віні Пуха». Арлоўскія маюць свае парэчкі, агрэст, бружмель, клубніцы, суніцы, вельмі смачнае варэнне атрымліваецца і з невялікіх яблычак — ранетак.

— Кожны госць зможа прадэгуставаць розныя віды варэння і купіць тое, што спадабалася. Ды і ўласны рэцэпт у музейчыку пакінуць, каб ім скарысталіся іншыя, — кажа Наталля.

Пры гэтым Арлоўскія разумеюць, што нерэальна, ды і не варта ўсім займацца толькі самім. Таму збіраюцца супрацоўнічаць з мясцовымі жыхарамі, каб менавіта яны выраблялі большую частку варэння і, адпаведна, мелі грошы ад яго продажу.

— Раней, калі быў маладзейшым, то думаў: трэба, каб грошай было паболей. А зараз разумею: вельмі важна, каб вакол цябе былі людзі, якія добра жывуць. Ды і сусветная практыка сведчыць, што агратурыстычнай справай трэба займацца не аднаму, а ў партнёрстве з іншымі людзьмі, якія прадастаўляюць гасцям тыя ці іншыя паслугі. Тады будзе больш даходу кожнаму, — лічыць Сяргей.

### «НАРОДНАЯ» АГАРОДЖА

Дарэчы, агароджу парку мяркуецца зрабіць з дапамогай гасцей маёнтка. Гэта будзе своеасаблівы праект народнай творчасці. У якасці асноўных матэрыялаў выкарыстаюць гліну і салому, а ўпрыгожаць агароджу разнастайнай расліннасцю. Наведвальнік парку пасля майстар-класу па саманным будаўніцтве атрымае магчымасць сваімі рукамі зрабіць той ці іншы па працягласці кавалак гэтай, так бы мовіць, народнай сценкі (наколькі хопіць жадання і сіл). Больш за тое, зможа пакінуць там на памяць аб сабе нейкі роспіс, гліняны ці іншы выраб.




Карта інтэрактыўнага біёлага-экалагічнага парку.

Зараз Сяргей і Наталля ствараюць грамадскае аб'яднанне па тэматыцы экалагічнага будаўніцтва і прадуктаў харчавання, каб удзельнічаць у розных праектах у гэтых сферах. Яны запрашаюць да супрацоўніцтва ўсіх зацікаўленых партнёраў, а мажліва, і валанцёраў, мецэнатаў.

...На развітанне цікаўлюся ў Арлоўскіх, чаму сваю ініцыятыву, якая атрымала падтрымку вышэйзгаданага міжнароднага праекта, яны назвалі «Сад натхненняў».

— Мы хочам стварыць парк, дзе б людзі, убачыўшы цікавае і прыгожае, натхняліся гэтымі ці новымі ідэямі, якія, мажліва, з'явяцца ў іх саміх. І нешта «рухалі» ў сваім жыцці, праяўлялі творчасць, развіваліся як асобы, — кажа Сяргей Арлоўскі. Тлумачэнне простае і, калі задумацца, блізкае кожнаму.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*prakopchik@zviazda.by*

*Гродзенскі раён.*

МТБанк
Банк свежих решений

Наименование банка:

## ЗАО «МТБанк», г. Минск

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 268 271 | 247 558 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 222 449 | 267 981 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 492 867 | 432 242 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 373 838 | 514 734 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 409 442 | 2 920 037 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 244 | 244 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 191 206 | 134 064 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 22 524 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 109 766 | 62 012 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 5 090 607 | 4 578 872 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 703 195 | 623 702 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 3 482 244 | 3 089 544 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 156 226 | 294 177 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 73 967 | 49 571 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 415 632 | 4 056 994 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 121 857 | 121 857 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 64 530 | 53 494 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 31 784 | 25 680 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 456 804 | 320 847 |
| 30 | Всего собственный капитал | 121 | | 674 975 | 521 878 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 5 090 607 | 4 578 872 |

**Ссылка на отчетность на сайте:**
**http://www.mtbank.by/about/reporting/balansbanka**

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2 квартал 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 520 224 | 503 011 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 338 960 | 340 314 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 181 264 | 162 697 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 272 207 | 208 996 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 35 100 | 26 889 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 237 107 | 182 107 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 4 195 | 9 753 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 77 745 | 32 013 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 2 431 | (71) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 227 655 | 131 121 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 61 101 | 22 492 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 266 429 | 181 589 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 14 681 | 11 253 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 55 078 | 85 028 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 9 966 | 10 952 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 45 112 | 74 076 |

**Ссылка на отчетность на сайте:**
**http://www.mtbank.by/about/reporting/pribilrep**

**Руководитель** **А.К. Жишкевич**

**И.о. главного бухгалтера** **Л.К. Левкович**

**Дата подписания: 10 июля 2015 г.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13, выдана Национальным банком Республики Беларусь 6 мая 2013 года.
УНП 100394906

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 29 июля 2015 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | - «лит.А1-2/к-кп, здание прачечной» общей площадью 1012 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-34660; назначение: здание неустановленного назначения) с элементами благоустройства: автодорога (540 кв. м), площадка под автостоянки (240 кв. м), пешеходная дорожка (206 кв. м); площадка под мусоросборник (4 кв. м), площадка (3 кв. м), бордюр 0,16 (40 кв. м, 251,22 м.п.); ограждение территории (16,40 м.п.), ограждение площадки под мусоросборник (5,50 м.п.); ворота (4,40 м.п.), ворота (7,60 м.п.); - электросети КЛ-0,4КВ (инвентарный номер по бухгалтерскому учету 3000842). |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Кабушкина, д. 64 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,3900 га, кадастровый номер 500000000002001769, назначение – эксплуатация и обслуживание здания прачечной |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 6 157 211 163 белорусских рубля |
| **Сумма задатка** | 600 000 000 белорусских рублей |
| **Условия торгов** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. 2. Дальнейшее использование приобретенного капитального строения осуществляется победителем торгов (покупателем) в соответствии с требованиями генерального плана г. Минска. |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

